Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва

Кафедра этналогіі і фальклору

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры

_________В.В.Калацэй
20 красавіка 2017 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта

__________Н.У.Карчэўская
27 красавіка 2017 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

**ЭТНАФАНІЧНЫ ПРАКТЫКУМ**

*для напрамку спецыяльнасці*
*1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)*

Складальнікі: В.В. Калацэй, Т.А. Пладунова

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 23 мая 2017 г.
пратакол № 9

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
Калацэй В.В., дацэнт кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі
Пладунова Т.А., старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»

**Рэцэнзенты:**
*кафедра тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»;*
*Г.А. Барвенава, загадчык аддзела выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт*

**Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:**
*кафедрай* этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 20 красавіка 2017 г. № 9);

*саветам факультэта* традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 27 красавіка 2017 г. № 9)

*саветам* установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 23 мая 2017 г. № 9)

Адказны за выпуск: Калацэй В.В.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Структура ВМК

1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА………………………………… 4

2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ……...……………………………… 9
2.1 Навучальны дапаможнік........................................................ 9
2.2 Канспекты (тэксты лекцый)………………………………... 10

3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ...…………………………………… 46
3.1 Вучэбныя выданні, рэкамендаваныя МА РБ ........................ 46

4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ..…………………………….. 47
4.1 Пералік пытанняў да семінарскіх і практычных заняткаў… 47
4.2 Заданні для кантралюемай самастойнай работы і графік яе кантролю………………………………………………………… 52
4.3 Пералік пытанняў да заліку, экзамену, выніковай атэстацыі………………………………………………………… 56
4.4 Тэматыка рэфератаў ……………………………………….. 62
4.5 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў…... 63

5 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ..……………………………... 66
5.1 Вучэбная праграма па дысцыпліне…………………………. 66
5.2 Тэматычны план па дысцыпліне …………………………… 67
5.3 Методыкі выкладання дысцыпліны……………………… 71
5.4 Метадычныя рэкамендацыі………………………………….. 73
5.5 Пералік выданняў і інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў для вывучэння дысцыпліны………………………. 75
5.6 Інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы...…………………. 80

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Этнафанічны практыкум» распрацаваны для студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю па спецыяльнасці 1-18 01 01 «Народная творчасць», накірунку 1-18 01 01-05 «Фальклор» спецыялізацыі 1-18 01 01-05 01 «Этнафоназнаўства».

Дысцыпліна «Этнафанічны практыкум» складаецца з раздзелаў «Этнафанічны практыкум: Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства» і «Этнафанічны практыкум: Этнафонія», належыць да цыкла дысцыплін спецыялізацыі. Яе першая частка «Этнафанічны практыкум: Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства» складаецца з шасці падраздзелаў – «Практыка фальклорнага выканальніцтва», «Выкананне спеўнага фальклору», «Выкананне спеўнага фальклору на сцэне», «Выкананне музычна-інструментальнага фальклору на сцэне», «Выкананне харэаграфічнага фальклору» і «Выкананне харэаграфічнага фальклору на сцэне»; а другая частка «Этнафанічны практыкум: Этнафонія» – з чатырох падраздзелаў – «Засваенне этнафанічнай традыцыі», «Этнафонія каляндарна-абрадавага песеннага цыкла» і «Этнафонія сямейна-абрадавага песеннага цыкла» і «Этнафонія пазаабрадавага песеннага цыкла».

Тэматыка заняткаў накіравана на ўдакладненне ў свядомасці будучых спецыялістаў па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны месца практычнай фалькларыстыкі ў навуковым дыскурсе пра чалавека і чалавецтва. Змест дысцыпліны мае на ўвазе набліжэнне сучасных студэнтаў-гуманітарыяў да практычнага разумення спецыфікі музычнага мыслення носьбітаў каранёвай культуры Беларусі і фарміравання спеўных і інструментальна-выканальніцкіх уменняў і навыкаў спецыялістаў-ахоўнікаў і даследчыкаў яе музычнага фальклору.

ВМК мае на мэце: 1) азнаямленне са спецыфікай дысцыпліны праз характарыстыку практычнай музычнай фалькларыстыкі як навукі, вызначэнне эвалюцыі сферы яе інтарэсаў, асноўных паняццяў і катэгорый, а

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таксама найбольш значных тэарэтычных і метадалагічных праблем; 2) азнаямленне студэнтаў з асноўнымі этапамі навуковага аналізу, трансляцыі і рэвіталізацыі музычных фальклорных адзінак; 3)раскрыццё асаблівасцяў сцэнічнай адаптацыі музычнага фальклору.

**Задачы ВМК:**

- пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі паняццямі і тэрміналогіяй вывучаемай дысцыпліны;
- засвоіць веды па гісторыі фарміравання практычнай музычнай фалькларыстыкі як асобнай навуковай галіны;
- раскрыць патэнцыял музычных фальклорных помнікаў для этнаэкалогіі беларусаў і для рэвіталізацыі іх нематэрыяльнай культурнай спадчыны;
- сфарміраваць прафесійную кампетэнцыю даследчыкаў і пераемнікаў (забяспечыць разуменне спецыфікі і значнасці музычнай фальклорнай спадчыны для практычнай дзейнасці па яе захаванні) у іх будучай прафесійнай дзейнасці.

**Спецыяліст павінен**

**ведаць:**

- асноўныя тэарэтычныя паняцці, разгледжаныя ў межах дадзенай дысцыпліны;
- асноўныя падыходы да класіфікацыі музычных фальклорных адзінак па відах і жанрах;
- агульную характарыстыку, структуру, змест і гістарычную панараму фарміравання і бытавання музычнага мастацтва вуснай традыцыі Беларусі;
- складальнікі традыцыйнага гукаідэала беларускай этнафоніі;
- функцыянальны змест рознажанравых песенных твораў;
- традыцыйны кантэкст бытавання этнафоніі розных жанраў у розных этнаграфічных рэгіёнах;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- механіку гукатворчасці фанацыйнага апарата ў рэжымах маўленчай і пеўчай этнафанацыі;
- выканальніцкія эталоны выдатных аўтэнтычных гуртоў, карыфеяў сольнай этнафанічнай традыцыі рэгіёнаў;

**умець:**

- выконваць песні, інструментальныя найгрышы на мінімум адным музычным інструменце, рытмізаваныя рухі (характэрныя для традыцыйнага сенсітыпу беларусаў), перанятыя ад носьбітаў фальклору ці з відэа- і аўдыякрыніц;
- праводзіць этнафанічны, гульнёвы трэнінг у фальклорным калектыве;
- аналізаваць помнікі музычнага фальклору з пункту гледжання іх прыналежнасці да той ці іншай хранальчнай ці відавай сістэмы;
- карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай па пытаннях дысцыпліны;
- засвойваць рэгіянальныя этнафанічныя традыцыі вусным шляхам (непасрэдна - метадам уключанага назірання і апасродкавана - з дапамогай аўдыё і відэа-апаратуры).
- працаваць над развіццём голасу на аснове аналізу мастацка-вобразнай сістэмы этнафанічнага рэпертуару;
- увасабляць песні розных жанраў з улікам дыялектнай, жанрава-стылявой спецыфікі, традыцыйнага кантэкста бытавання;
- ажыццяўляць рэпетыцыйны працэс з рознымі саставамі спевакоў у розных узроставых групах;
- фарміраваць рэпертуар у спеўнай суполцы, ствараць канцэртныя праграмы з улікам сінкрэтызму вакальных, гульнявых і музычна-пластычных элементаў этнафанічнай партытуры;
- ажыццяўляць мастацкае рэканструяванне абрадавых і пазаабрадавых рэкрэацыйных практык у форме арганізаванай фалькларызаванай традыцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Метады навучання у рамках дадзенай дысцыпліны адпавядаюць агульным патрабаванням да фарміравання прафесійных кампетэнцый студэнта. Метадалагічнымі асновамі дысцыпліны «Этнафанічны практыкум» з'яўляюцца: тлумачальна-ілюстратыўныя, рэпрадукцыйныя метады (рассказ, дэманстрацыя адзінак музычнага фальклору для пераймання, тлумачэнне, гутарка, дыскусія, лекцыя, дэманстрацыя кіна- і аўдыязапісаў), праблемныя (творчы дыялог, назіранне), метады самастойнай работы студэнтаў (работа з першакрыніцамі, расшыфроўка аўдыя- і відэаматэрыялаў, развучванне песень, інструментальных найгрышаў, рытмізаваных рухаў), кантрольна-ацэначныя метады (адказы і творчыя паказы на кантрольных занятках).

Адзнака і дыягностыка дасягненняў студэнтаў выконваецца паэтапна, уключаючы творчыя паказы фальклорных адзінак, апытанне на практычных занятках па пэўных раздзелах вучэбнай дысцыпліны і выніковы кантроль у форме залікаў і іспыту.

Тэхналагічны інструментарый выкладання дысцыпліны прадстаўлены наступнымі педагагічнымі метадамі навучання:

1. *па крыніцы перадачы і ўспрымання інфармацыі: вусныя (гутарка, апавяданне); наглядныя (знаёмства з дэпаніраваным навукова-метадычным фондам, з аўдыё-відэа матэрыяламі); практычныя (слуханне і этнафанічная транскрыпцыя аўтэнычных вакальных узораў)*
2. *па характары пазнавальнай і праектнай дзейнасці: рэпрадуктыўныя, прадуктыўныя, пошукавыя, творчыя*
3. *па відах вучэбных заняткаў і дыдактычнай задачы: тлумачэнне, паказ, практыкаванне, аналіз, замацаванне.*

Самастойная работа студэнтаў накіравана на развіццё пеўчага голасу ў этнафанацыйным рэжыме, перайманне аўтэнтычных вакальных узораў, выпрацоўку пеўчых навыкаў на аснове поліфункцыянальнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

markdown
рознажанравай этнафоніі рэгіёнаў Беларусі; уключае слуханне і этнафанічны аналіз аўтэнтычных песенных узораў, зададзеных выкладчыкам і замацаванне этнафанацыйных уменняў і навыкаў, набытых у класе, а таксама пашпартызацыю і этнафанічную транскрыпцыю экспедыцыйных вакальных узораў, самастойнае іх развучванне. Замацаванне тэарэтычных ведаў і практычных уменняў па дысцыпліне ўключае наступныя заданні: работа з навукова-метадычнай літаратурай па этнафоніі, метадах навучання мастацтву вуснай спеўнай традыцыі; фарміраванне этнафанатэкі; прагляд відэаматэрыялаў паводле аўтэнтычнай вакальнай экспрэсіі; наведванне этнаграфічных і пост-фальклорных канцэртаў.

Усяго гадзін па дысцыпліне – 322, у тым ліку лекцый – 14, практычных – 232, індывідуальных – 76. Курс цесна звязаны з іншымі дысцыплінамі цыкла (Беларуская этнамузыкалогія, Методыка экспедыцыйных этнамузыкалагічных даследаванняў), паколькі ўводзіць студэнтаў у кантэкст асноўных базавых паняццяў практычнай фальклярыстыкі, веданне спецыфікі якіх неабходна для аптымізаванай дзейнасці будучых даследчыкаў і транслятараў фальклору. Разам з тым курс мае ў асяродку родасных дысцыплін адмысловае месца, паколькі яго змест будзе выкарыстаны ў практычна-педагагічнай, арганізацыйнай дзейнасці выпускнікоў спецыяльнасці «Народная творчасць» напрамку «Фальклор» спецыялізацыі «Этнафоназнаўства».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 НАВУЧАЛЬНЫ ДАПАМОЖНІК ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

Калацэй В.В.Ля вытокаў этнічнага мастацтва / В.В. Калацэй // Асновы мастацтва. – 2000. – №2. – С.98–116.

Калацэй В.В. Традыцыйная вакальная культура беларусаў / В.В. Калацэй // Асновы мастацтва. – 1998. – № 2. – С.101–104.

Калацэй, В.В. Методыка ўключанага назірання і дыдактыка творчых ВНУ / В.В. Калацэй // Веснік БелДІПК. – 2004. – № 1 (2). – С.147 – 148.

Пладунова, Т.А. Купальскі спеўнік / метад. дапаможнік / Т.А. Пладунова. – Мінск: Інстытут культуры Беларусі, 2014 – 160 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2. 2 КАНСПЕКТЫ ЛЕКЦЫЙ

### УВОДЗІНЫ

**Пытанні па тэме**

- Захаванне і пераемнасць музычнага мастацтва вуснай традыцыі.
- Мэты і задачы вывучэння этнафоніі.

**Літаратура па тэме**

*Пладунова, Т.* Засваенне і актуалізацыя каляндарна-абрадавых традыцый у сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы / Т. Пладунова // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, перaймання : зборнік навуковых прац удзельнікаў IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 29 – 30 красавіка 2010 г.) / БДУКМ ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2010. – С. 126 – 129.

*Салавей, Л.М.* Валачобныя песні / Л.М.Салавей // Валачобныя песні / [склад. Г.А.Барташэвіч, Л.М.Салавей, склад. муз. часткі В.І.Ялатаў ; рэд. тома К.П.Кабашнікаў]. – Мн.: Навука і тэхніка, 1980. – 560 с., нот. іл. – (Беларус. нар. творчасць. / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору).

*Восточнославянский* фольклор: слов. науч. и нар. терминологии / Редкол.: К.П.Кабашников (отв. ред.) и др. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – С. 178 – 200.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Захаванне і пераемнасць музычнага мастацтва вуснай традыцыі**
Якасная рэпрэзентацыя каранёвай беларускай культуры – адна з важных і складаных задач па забеспячэнні этнакультурнага працэсу ва ўмовах глабалізацыі. З вопыту педагагічнай практыкі выкладчыкаў спецыялізацыі

“Этнафоназнаўства” па засваенні этнафоніі[1] Беларусі і ўкараненні яе ў вучэбна-выхаваўчы працэс магчыма паведаміць наступнае.

Хацелася б выказаць надзею, што, не гледзячы на паступовае, нажаль, аб’ектыўнае затуханне традыцыйнай культуры ў аўтэнтычных формах яе бытавання, мастацкія каштоўнасці, назапашаныя ёю магчыма вывучаць сёння (шляхам уключанага назірання, альбо з архіўных фальклярыстычных крыніц), па-мастацку пераасэнсоўваць і актуалізаваць у другасных формах фальклору - сіламі сучасных фальклорных гуртоў.

**Мэты і задачы вывучэння этнафоніі**

***Мэта:*** узбагачэнне будучых спецыялістаў па фальклору тэарэтычнымі ведамі і практычымі навыкамі па засваенні і творчаму ўвасабленню этнафанічнай спеўнай культуры Беларусі.

*Задачы :*

1) фарміраванне ў студэнтаў цікавасці да вакальнай этнафоніі беларусаў;

2) фарміраванне ў студэнтаў навуковага падыходу, эстэтычных крытэрыяў і творчай матываванасці да вывучэння і пераймання этнафанічнай традыцыі;

3) развіццё навыкаў сольнага выканальніцтва і спеваў у суполцы (у аднародным і змешаным саставах);

4) набыццё ведаў аб будове галасавога апарата і механіцы пеўчай фанацыі;

5) выхаванне ўмення па-мастацку выразна выконваць песенныя творы розных жанраў розных рэгіёнаў Беларусі шляхам слухання, сінхроннай

[1]Тэрмін «этнафонія» прапанаваны украінскім этнамузыколагам К.В.Квіткам у дачыненні да этнічнай спецыфікі тэмбравых асаблівасцей гуку, манеры выканання і асаблівасцей фразіроўкі ў народных спевах [1, 71]. Як раздзел этнамузыкалогіі, этнафоназнаўства разглядае традыцыйны гукаідэал як інтанацыйна-тэмбравую мадэль музычнай традыцыі рэгіёна (арэала), даследуе яе сецыфічныя характэрыстыкі: тэмбр, гукавышыннасць, дынаміку, спосабы гукавымання і фразіроўкі, тыпы голасавядзення, дыхальныя тэхнікі па разліку акустычнага сігналу, своеасаблівасць інтанацыі, варыятыўнасць суладдзя галасоў ў ансамблі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

імітацыі і творчай імправізацыі (на прыкладзе аўтэнтычных узораў, запісаных ад носьбітаў этнафанічнай спеўнай традыцыі).

Дысцыпліна складаецца з лекцыйных заняткаў (уводзін ў тэорыю этнафоніі і развіцця пеўчага голасу); гуртавых практычных заняткаў з выкладчыкам, скіраваных на набыццё этнафанацыйных навыкаў у спеўнай суполцы; індывідуальных практычных заняткаў у класе з выкладчыкам па ўдасканаленні вакальнай тэхнікі; самастойнай работы студэнтаў.

У выніку вывучэння дысцыпліны «Этнафанічны практыкум: Этнафонія» студэнт павінен *ведаць:*

- складальнікі традыцыйнага гукаідэала беларускай этнафоніі;
- функцыянальны змест рознажанравых песенных твораў;
- традыцыйны кантэкст бытавання этнафоніі розных жанраў у розных этнаграфічных рэгіёнах;
- механіку гукатворчасці фанацыйнага апарата ў рэжымах маўленчай і пеўчай этнафанацыі;
- выканальніцкія эталоны выдатных аўтэнтычных гуртоў, карыфеяў сольнай этнафанічнай традыцыі рэгіёнаў.

*умець:*

- засвойваць рэгіянальныя этнафанічныя традыцыі вусным шляхам (непасрэдна - метадам уключанага назірання і апасродкавана - з дапамогай аўдыё і відэа-апаратуры).
- працаваць над развіццём голасу на аснове аналізу мастацка-вобразнай сістэмы этнафанічнага рэпертуару;
- увасабляць песні розных жанраў з улікам дыялектнай, жанрава-стылявой спецыфікі, традыцыйнага кантэкста бытавання;
- ажыццяўляць рэпетыцыйны працэс з球 рознымі саставамі спевакоў у розных узроставых групах;
- фарміраваць рэпертуар у спеўнай суполцы, ствараць канцэртныя праграмы з улікам сінкрэтызму вакальных, гульнявых і музычна-пластычных элементаў этнафанічнай партытуры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- ажыццяўляць мастацкае рэканструяванне абрадавых і пазаабрадавых рэкрэацыйных практык у форме арганізаванай фалькларызаванай традыцыі.

## 1. ЭТНАФОНІЯ ЗІМОВАГА ЦЫКЛА

**Пытанні па тэме**

- Рэпрэзентацыя каранёвай беларускай культуры.
- Папулярызацыя найважнейшай формы творчай камунікацыі – народнай песні.
- Методыка мастацкага рэканструявання зімовых каляндарных абрадаў.

**Літаратура па тэме**

*Восточнославянский* фольклор: слов. науч. и нар. терминологии / Редкол.: К.П.Кабашников (отв. ред.) и др. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993.

*Говард, М.* Сучасная культурная антрапалогія / М. Говард ; пад рэд. П. Царашковіча. – Мінск : Тэхналогія, 1995. – С. 278 – 300.

*Можейко, З.Я.* Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт систем.-типол. исслед. / З.Я. Можейко. – Мінск : Наука и техника, 1985. – 247с.

*Хейзинга, Й.* Homo ludens. В тени завтрашнего дня / Й. Хейзинга; пер. с нидерланд. и примеч. В.В. Ошиса ; общ. ред. и послесл. Г.М. Тавризян. – М. : Прогресс : Прогресс-Академия, 1992. – 464 с.

*Чистов, К.В.* Народные традиции и фольклор / К.В.Чистов. – Л. : Наука, 2008. – С. 174 – 184.

**Рэпрэзентацыя каранёвай беларускай культуры**

Пераемнасць і актуалізацыя беларускай этнафоніі ажыццяўляецца аматарскімі фальклорнымі гуртамі сродкамі каляндарна-абрадавых свят, у пошуку шляхоў і перспектыў увядзення іх у кантэкст сучаснай культуры ў якасці эстэтычна пераасэнсаванай традыцыі. Падчас сваёй педагагічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці аўтар сумесна з педагогамі-лідэрамі дзіцячых і маладзёжных гуртоў неаднаразова праводзіў святочныя імпрэзы і фальклорныя фестывалі ў сістэме пазашкольнага выхавання і ВНУ, накапіў пэўны досвед у галіне мастацка-практычнай фальклярыстыкі[2], які абагульніў ў методыцы па засваенні каляндарна-абрадавых свят сучаснікамі.

**Папулярызацыя найважнейшай формы творчай камунікацыі – народнай песні.**

Задачай правядзення каляндарна-абрадавых свят ва урбанізаваных умовах, на наш погляд, з'яўляецца папулярызацыя найважнейшай формы творчай камунікацыі – народнай песні – квінтэсэнцыі абраду. Апошняя і сёння здольна ажыццявіць адну з галоўных сваіх функцый – дэманстрацыю жыццёвых сіл прадстаўнікоў грамадства ў еднасці адзін з адным і з прыродай.

Апантанасць укладальніка, як педагога, ідэяй мастацкага рэканструявання каляндарана-абрадавых свят сугучна эстэтычнай канцэпцыі засваення фальклору філосафа У.М. Конана, які заклікае этнапедагогаў

[2] Этнакультурны праект па актуалізацыі каляндарна-абрадавых традыцый "Па святах "Сонечнага крыжа" быў распачаты ў 1997 годзе супрацоўнікамі лабараторыі фальклору Нацыянальнага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі В. Калацэем і Т.Пладуновай з мэтай выбудовы ***мадэлі этнакультурнага выхавання*** ўдзельнікаў дзіцячых і маладзёвых фальклорных калектываў пазашкольных установ выхавання на аснове цыклічнасці беларускага народнага календара, рухомыя святы і прысвяткі якога ўтрымліваюць два яго стабільныя стрыжні – летні і зімовы сонцаварот (Купалле/ Каляды), веснавое і восеньскае раўнадзенства (Гуканне вясны, Вялікдзень/ Багач). Штогод, пачынаючы з 1998 года, а з 2003 года сумесна з БДУ культуры і мастацтваў, лабараторыя фальклору (з 2003 па 2009 гг. аддзел народных мастацкіх рамёстваў і фальклору НЦМТДМ) праводзіла шэраг гарадскіх і рэспубліканскіх этнакультурных мерапрыемстваў, адпаведна пэўнай каляндарна-абрадавай святочнай кропцы "Сонечнага крыжа": "Гуканне вясны на ўзгорках Мінска" 03.1998; "Каляды ў НЦ" 01.1999; "Юр'я ў Тальцы" 04.1999 (сумесна з Талькаўскай СШ Мінскага раёна); "Купалле ў Вязынцы" 06.2000-2009; танцавальна-гульнёвыя вечарыны для дзяцей і моладзі ў дыска-клубах г. Мінска ("Надыход вясны" 03.2001, "Доўгі танок" 06.2001, "У абдымках сонца" 09.2001, "Кола да "крывых вечароў" 01.2002, 2003, "Павада" 04.2002, 2003, "За Марцінаў дом" 11.2005, "Лё" 03.2006, "Крывы танок" у "Стэпе" 05.2007, "Дуды Юр'я зімовага" 12.2007); фальклорныя летнікі ў НДАЛ "Зубраня" (рэспубліканкія фестывальныя святы "Купалле па-над Нараччу" 06.2002, "Свята традыцыйна-побытавага танца" 06.2003, "Гуканне вясны на беразе Нарачы" 05.2004); Рэспубліканскі фестываль дзіцячых фальклорных калектываў "Калядны фэст" 01.2005; гарадскія святы "Гуканне вясны на Свіслачы" 04.2005, "Юр'я ў Парку Горкага" 04.2006, "Зялёныя святкі ў Мінску" 05.2007; "Масленіца" у вёсцы Строчыцы 03.2008; "Купалле на фестывалі "Берагіня" 06.2008; "Калядны фэст" 01.2010.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

актуалізаваць фальклорную спадчыну метадамі *мастацка-практычнай фальклярыстыкі* і, уласна, тэарэтычнай і метадычнай распрацоўкай гэтых метадаў. Пераемнасць і актуалізацыя фальклорнага мастацтва павінна адбывацца ў рэчышчы ўвядзення класічных відаў народнай творчасці як развітай мастацкай сістэмы ў кантэкст сучаснай мастацкай культуры. У гэтым творчым працэсе магчыма выкарыстоўваць не толькі захаваныя ў сучасным побыце і народнай памяці фрагменты вуснай і візуальнай (абрады, харэаграфія, музыка) народнай творчасці, але ўвесь корпус запісаных і дэпаніраваных твораў фальклору з улікам яго нацыянальнай самабытнасці і рэгіянальных варыянтаў.

**Методыка мастацкага рэканструявання зімовых каляндарных абрадаў**

З 2004 года у рамках спецылізацыі "Этнафоназнаўства" распрацоўвалася методыка мастацкага рэканструявання каляндарных абрадаў на рэгіянальным матэрыяле. Яна прапагандуе форму свята, максімальна набліжаную да аўтэнтычнага арыгіналу. Пры адпраўленні абраду ва ўмовах гарадской рэканструкцыі непазбежны элементы мастацкага пераасэнсвання, аднак яны маюць на мэце падкрэсліць сэнсавыя асаблівасці абрадавага свята, не парушаючы нормаў народнай этыкі і эстэтыкі і пакідаючы месца для імправізацыі выканаўцаў.

На даследчым этапе мастацкага рэканструявання свята неабходна распрацаваць *абрадавую карту* з пазначэннем асноўных кампанентаў яго адпраўлення. У яе выбудове мы абапіраемся на класіфікацыю песенных тэкстаў вывучаемага свята, а таксама на методыку даследавання абрадаў расійскіх даследчыкаў М.І. і С.М. Талстых, якія ўяўлялі абрадавую дзею як сукупнасць раўназначных па функцыянальна-семантычнай нагрузке кодаў. Паводле высноў даследчыкаў архітэктоніка гэтых кодаў выбудоўваецца наступным чынам: тэмпаральны код – час правядзення абраду (свята); акцыянальны код – паслядоўнасць абрадавых дзей (рытуал); лакатыўны код – месца правядзення абраду (свята); персанальны код – кола ўдзельнікаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наяўнасць маскіраваных персанажаў; атрыбутыўны код – выкарыстанне абрадавых атрыбутаў, адзення, маскіравання; музычны код – тыпавыя напевы з адмысловымі этнафанічнымі прыкметамі і гукаідэал інструментльнай этнафоніі; вербальны – наяўнасць заклікаў, замоў, зычэнняў у абрадзе.

Ва ўмовах Беларусі распрацаваная абрадавая карта (мал. 1) можа быць рэкамендавана этнапедагогам, кіраўнікам аматарскіх фальклорных калектываў, культарганізатарам для сістэматызацыі абрадавых кампанентаў свят як даследчы метад іх мастацкага рэканструявання .

На аснове гэтай методыкі абрадавае свята магчыма адаптаваць пад рэгіянальнае (міжрэгіянальнае), ці агульнанацыянальнае – шляхам вылучэння асобных абрадавых этапаў і падбору да іх песенных узораў (адпаведна мэце правядзення свята). Па дадзенай методыцы студэнты першага набору спецыялізацыі “Этнафоназнаўства” ажыццявілі дыпломныя праекты “Купалле на Полаччыне”, “Купалле на Віцебскім Падзвінні”, і “Беларускае Купалле на фестывалі “Берагіня” ў вёсцы Ракаў Валожынскага раёна і на V Міжнародным фестывалі фальклорнага мастацтва “Берагіня” у г.п. Акцябрскі Гомельскай вобласці [2, 260].

## 2. ЭТНАФОНІЯ ВЕСНАВОГА І ЛЕТНЯГА ЦЫКЛАЎ

**Пытанні па тэме**

- "Сонечны крыж", вытокі каляндарнай абраднасці беларусаў і песні вясны
- Купальскія песні і этнафонія
- Жніўныя песні і этнафонія

**Літаратура па тэме**

*Можейко, З.Я.* Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт систем.-типол. исслед. / З.Я. Можейко. – Мінск : Наука и техника, 1985. – 247с.

*Назина, И.Д.* Становление и развитие белорусского этноинструментоведения как специальной научной дисциплины / И.Д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Назина // Белорусская этномузыкология: Очерки истории (XIX – XX вв.) / З.Можейко, Т.Якименко, Т.Варфоломеева и др. ; под ред. З. Можейко. – Минск : Тэхналогія, 1997. – С. 199 – 232.

*Валачобныя* песні / АН БССР, Ін–т мастацтвазнаўства, этнагр. і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 572 с. (Беларуская народная творчасць ).

*Веснавыя* песні / АН БССР, Ін–т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 563 с. (Беларуская народная творчасць).

*Восточнославянский* фольклор: слов. науч. и нар. терминологии / Редкол.: К.П.Кабашников (отв. ред.) и др. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – С. 178 – 200.

*Говард, М.* Сучасная культурная антрапалогія / М. Говард ; пад рэд. П. Церашковіча. – Мінск : Тэхналогія, 1995. – С. 278 – 300.

*Мажэйка, З. Я.* Песні Беларускага Паазер'я / З.Я. Мажэйка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 494 с., нот. іл.

*Пладунова, Т.А.* Купальскі спеўнік / метад. дапаможнік / Т.А. Пладунова. – Мінск: Інстытут культуры Беларусі, 2014 – 160 с.

*Чистов, К.В.* Народные традиции и фольклор / К.В.Чистов. – Л. : Наука, 2008. – С. 174 – 184.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**"Сонечны крыж", вытокі каляндарнай абраднасці беларусаў і песні вясны**

Святочна-каляндарная абраднасць з'яўлялася "стрыжнем" жыцця вясковага насельніцтва Беларусі напрацягу вякоў, а магчыма і тысячагоддзяў.

Пра тое, што ўсё рухаецца ў часе, чалавек заўважыў даўно. Змена дня і ночы, зімы і лета спадарожнічае нам праз ўсё жыццё. Знаёмыя з пачаткамі астраноміі ведаюць, што жыццё Зямлі падпарадкавана рытмічным законам: сутачным, якія абумоўленыя абаротам Зямлі вакол уласнай восі; месячным, звязаным з абаротам Месяца вакол Зямлі; гадавым, які вызначаецца абаротам

Зямлі вакол Сонца. Гэтыя з'явы паўтараюцца, складаючы добра бачныя цыклічныя паслядоўнасці. Элементы гэтых цыклаў былі пакладзены нашымі продкамі ў аснову вымярэння часу. Так з'явіўся падзел часу на дні, месяцы, гады.

Безумоўна, успрымалі час яны зусім па іншаму, чым мы, і выраз "13 лютага 1256 года" наўрад ці што казаў */Сцеблін-Каменскі/* жыхару Ісландыі ў XIII ст., аднаму з муравальшчыкаў Камянецкай вежы, ды і носьбітам традыцыйнай еўрапейскай культуры больш пазнейшых часоў. Таксама прымусяць заняцца нязвыклымі вылічэннямі выразы:"перад Пятром пятым днём", "пасля поўні, веташам" , "на трэцяе лета пасля паводкі",- калі будуць адрасаваныя нашаму сучасніку. Кожны ўспрымае наваколле, у тым ліку і бег часу, праз "сістэму каардынатаў", якія зададзеныя культурай, да якой ён належыць.

Каляндарна-абрадавыя святы і ёсць першапачатковая форма лічэння часу, протакалендара. Гіпатэтычна яны маглі з'явіцца яшчэ ў палеаліце */Патупа/,* але ж больш разгорнутую, стабільную форму набылі са з'яўленнем вытворчай эканомікі (жывёлагадоўлі і земляробства).

Жывёлагадоўля і земляробства з'явіліся ў часы неаліту – новага каменнага веку. На землях Беларусі і суседняе Літвы яны пачалі распаўсюджвацца з 4 тыс. да н.э. */Rimantiene, 10/.*

Як мяркуюць многія навукоўцы, напрыклад, Р.Грэйвс */Грэйвс/,* у даарыйскай матрыярхальнай Еўропе непадзельна панаваў культ Месяца. Яго лічылі сімвалам трыадзінай Багіні – маці ўсяго. Тагачасовыя жыхары былі аб'яднаны ў суполкі, дзе пануючай ідэалогіей быў матрыярхат, а час адлічваўся па цыклам Месаца. Адносна этнічнай прыналежнасці тагачасовага насельніцтва Беларусі ёсць розныя меркаванні. Магчыма, яе неалітычныя жыхары былі сваякамі фіна-ўграў.

Ёсць падставы лічыць, што большасць земляробчай абраднасці беларусаў мае карані ў тых часах. Праца земляроба пачынаецца, калі глеба гатовая для насення – ўвясну. Натуральна, што земляробам лагічна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

святкаваць пачатак года, калі пачынаецца чарговы земляробчы гадавы цыкл – увясну. А характар росту раслін моцна залежыць ад фазы Месяца, у якую іх высажваюць. Многія беларускія веснавыя земляробчыя святы сімвалізуюць гэта і адлічваюцца, зыходзячы з фазаў Месяца.

Як даказала Марыя Гімбуцьене, неваяўнічыя неалітычныя цывілізацыі і суполкі Старой Еўропы (Old Europe) прыйшлі ў заняпад пад ўціскам агрэсіўных качавых індаарыйскіх і індаіранскіх народаў – носьбітаў індаеўрапейскіх гаворак.

На рубяжы III-II тысячагоддзяў да н.э. на тэрыторыі Беларусі прыйшлі індаеўрапейцы. Існуе меркаванне, што прадстаўнікі сярэдне-дняпроўскай археалагічнай культуры, пра якіх ідзе гаворка, з'яўляліся ўжо носьбітамі балтыйскіх моў */Загарульскі/.* Старажытныя балты-індаеўрапейцы былі вогне- і сонцапаклоннікамі. Таму культ Месяца адышоў на другі план, але не знік канчаткова (некаторыя т.зв. "р у х о м ы я " святы вылічваюцца, зыходзячы з месяцавай поўні). Увогуле ж жыхары Еўропы суадносяць бег часу з сонечным календаром.

Сонечны каляндар лічыцца "сезонным", маючым сувязь з паляўнічым (гэта значыць, з мужчынскім у першую чаргу) супольным промыслам, вытворча-прамысловай дзейнасцю, у адрозненне ад жаночага, які звязаны з перадачай ведаў, каляндарнымі назіраннямі (першапачаткова за месяцавым календаром цяжарнасці, якая у жанчын складае 10 лунарных = 9 каляндарных месяцаў), жаночай сімволікай */Фралоў,88-91/.*

Каляндарная сістэма прамыславікоў-земляробаў абапіраецца на т.зв. "Сонечны крыж" (летні і зімовы сонцавароты + веснавое і восеньскае раўнадзенствы). Гэтыя даты лічыліся, відаць, галоўнымі святамі, апорнымі кропкамі, зыходзячы з якіх арыентаваліся ў часе і ладзілі жыццё.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СВЯТЫ «СОНЕЧНАГА КРЫЖА»[3]




У сувязі з *неалітычнымі* вытокамі земляробства і традыцыйных (вясковых каляндарна-абрадавых) культур еўрапейцаў-земляробаў вельмі спрэчнай і нелагічнай з'яўляецца *спрадвечнасць* святкавання новага года менавіта на Каляды. Тым больш, што карані "зімовасці" навагодняга святкавання нецяжка знайсці. 24 снежня святкаваць нараджэнне Хрыста пачалі ў Рыме ў 5 ст. н.э. Да гэтага ў гэты дзень у імперыі актыўна святкавалі нараджэнне індаіранскага героя Мітры. Згодна індаіранскаму міфу, некалі у гэты дзень пярун ударыў у скалу і нарадзіўся Мітра – валадар досвітку і захаду – часоў, калі святло злучаецца з цемрай. Культ Мітры быў вельмі пашыраны ў імперскім Рыме, шмат у чым на яго падмурку імператары спрабавалі ўвесці манатэістычны культ непераможнага сонца – Геліаса. Таму

[3] Графічнымі сімваламі «☻» і «☺» пазначана працягласць (суадносіны працягласці) ночы ☻ і дня ☺.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

снежаньскае светкаванне народзін Мітры – Сонца – Геліаса ў часы Рымскай імперыі было вельмі пашырана ў Еўропе. Гэтую дату рымская Царква ў 5 ст. і прызначыла як дату святкавання народзін Хрыста. Святкаванне новага года ўзімку, хутчэй за ўсё, прыйшло ва Ўсходнюю Еўропу з хрысціянствам.

Як вядома, месячны і сонечны календары супадаюць толькі раз на 52 гады – завяршаючы т.зв. Метонаў цыкл. Месяц вельмі моцна ўплывае на расліннасць (характар яе росту) і вадкасці (напрыклад, прылівы і адлівы), але ў працэсе росту ўсё жывое атрымлівае энэргію ўсё ж такі ад Сонца. З нагоды многіх прычын больш зручная аснова лічэння часу для чалавечых супольнасцей да апошняга моманту – сонечны каляндар. Заўважная аснова яго, замацаваная ў арыентаваных на дні сонцаваротаў і раўнадзенстваў мегалітычныя пабудовы – “Сонечны крыж”.

Першы дзень такой сістэмы адпавядае першаму дню пасля ЗСС - 23-му снежня па Грыгарыянскаму календару – ГК (даты тут і далей заўсёды дадзеныя па ГК, акрамя спецыяльна пазначаных выпадкаў). Увогуле, трэба сказаць, што Каляды (ражство Хрыстова) – гэта 25 снежня па абодвух календарах (па ГК і па ЮК – Юліянскаму), Юр'я (дзень Св.Георгія) – 23 красавіка па абодвух і г.д. Вось толькі, калі ўвесь свет жыве, напрыклад, у 7-мым студзеня, праваслаўная царква адлічвае яшчэ 25-ее снежня, таму, што карыстаецца ЮК, які адстае ад ГК на 13 дзён. Як след, сучаснае святкаеанне шэрагу святаў на Беларусі адхілілася ад астранамічнага календара (і кропак “Сонечнага крыжа”) на даволі значны тэрмін. Гэтае становішча разам з шырокараспаўсюджанымі ў спецыяльнай і неспецыяльнай літаратуры выразамі "па старому стылю" і "па новаму стылю" паспяхова перашкаджае наданню інфармацыі па святочна-каляндарнай абраднасці выгляду сістэмы. А, як вядома, засвоіць нейкія веды магчыма толькі калі яны сістэматызаваныя.

Першы дзень сістэмы “Сонечнага крыжа” адпавядае першаму дню пасля ЗСС – 23-му снежня. Аднак заўважыць у гэты час моцныя змены працягласці дня немагчыма. Сонца непарыўна "расце" праз ланцужок святаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вясенне-летняга цыклу ажно да *ЛСС*, калі не заўважыць вялікую працягласць светавога дня ўжо проста немагчыма. Недзе на сярэдзіне гэтага шляху знаходзіцца *веснаеое раўнадзенства* 20-21 сакавіка. У гэты час дзень відавочна роўны з ноччу, Сонца – у сіле, пра што разам з іншымі прыкметамі сведчаць падрыхтаваныя да сяўбы палеткі. Прыкладна да гэтага тэрміну, відаць, было прымеркавана святкаванне Валачобнага свята беларусаў (літоўскага свята Velykos, Lalavimas), Вялічка, Вялікадня, якое з панаваннем хрысціянства злілася з Пасхай. Апошняя ж са старажытнаюдзейскіх часоў святкуецца ў першую нядзелю пасля першай месяцавай поўні, якая адбываецца пасля *ВВР /Савецкі энцыклапедычны слоўнік, 976/.* Народны Вялікдзень так і застаўся святам уласна земляробчай тэматыкі, знітаваным з пачаткам *гаспадарчага* года.

У валачобных песнях беларусаў і літоўцаў і іх гульнях з вялікоднымі яйкамі-біткамі лёгка чытаецца яшчэ палеалітычны ці неалітычны міф, пашыраны сярод фіна-ўгорскіх народаў. Ён распавядае пра т.зв. “сусветнае яйка”, знесенае птушкай, якая лятала над першасным водным хаосам, калі яшчэ не было ні Сонца, ні Месяца, ні зораў, ні зямлі – толькі вада і цемра.

21-22 чэрвеня – найвышэйшая кропка "крыжа" – *летні сонцаварот.* Гэта беларускае Купала, літоўскае Rasa, латышскае Ligo, Ligua, вельмі старажытнае свята, вядомае ўсім народам Еўропы. Семантыку (сэнс) святкавання навукоўцы звязваюць з зашыфраванай у абрадавых дзеяннях і амаль што забытай ідэяй шлюбнага адзінаборства неба і зямлі, полымя і вады, якія, пры працягванні ланцугу бінарных апазіцый (супраць-пастаўленняў, з дапамогаю якіх, на думку філосафаў, засвойвалі наваколле нашы продкі пачынаючы з часоў, якія папярэднічалі ўзнікненню вялікіх цывілізацый старажытнасці */Міфы,161/)* атаясамліваліся з міфічнымі блізнятамі (братам і сястрою), рытуал ачышчэння якіх пакладзены ў падмурак летнесонцаваротнай абраднасці шэрагу традыцый, у тым ліку – беларускай */Іваноў&Тапароў,230/.* Адсюль – матыў інцэсту ў шматлікіх купальскіх баладах беларусаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Апасля летняга сонцавароту працягласць дня пачынае змяншацца ў кірунку *ЗСС.* І ў дні, блізкія да *восеньскага раўнадзенства,* а дзе-нідзе і ўласна 21 верасня, святкавалася апошняе са святаў "Сонечнага крыжа" - старажытнае свята заканчэння ўборкі зерневых – Багач, у хрысціянскія часы прымеркаванае да Раства Багародзіцы. Увага да зямлі адлюстравана і ў свяце пахаваных у ёй продкаў – Дзядах, якое у хрысціянскія часы было прымеркавана да пачатку кастрычніка. Магчыма, некалі гэтыя святы былі аб’яднаны. Ланцуг святаў працягвае рухацца ў напрамку Калядаў, каб у іх завяршыць кола старога года .

Час Калядаў у народных уяўленнях звязаны з “паваротам Сонца на лета, а зімы – на мароз”. Час імкнецца *"Ко Ладу" (адно* са шматлікіх тлумачэнняў этымалогіі словаў "каляда", "Каляды" */Капуста,39/).*

Шматлікія рамантычныя даследчыкі міфалогіі лічылі слова ‘Ладо’ стараславянскім абазначэннем боства Сонца*. Улічваючы, што на санскрыце *кола часу – "каля-чакра",* некаторыя лічаць лінгвістычнай асновай *"каляд", "календара"* санскрыцкія словы *"кола" і "кола часу" /Суднік,4/.*

З конаднем Калядаў звязваюцца падзеі т.зв. "а с н о ў н а г а м і ф а славянскай міфалогіі", які апавядае пра перамогу ў адзінаборстве бога Маланкі Перуна над сваім змеепадобным ворагам */Іваноў&Тапароў,118/,* у выніку якой з'яўляецца шмат вільгаці, вады, якая пакрывае (затапляе) ўсё наваколле. Падаецца, што гэта сімвалізуе першапачатковы водны хаос, з якога, па паданнях і міфах, і пачаўся некалі сусвет.

Асобныя звесткі пра традыцыйны каляндар варта зводзіць у адзіны тэкст, схему, малюнак, што значна спрашчае запамінанне яго асноўных пазіцый і заканамернасцей арганізацыі.

Графічна гадавое кола асноўных святаў беларусаў магчыма рэпрызентаваць такім чынам:

---

* Пра ўяўленні наконт Сонца як крыніцы пладаноснага пачатку, вільгаці, цяплыні і святла, якія знайшлі выраз у старажытных назвах боствыў: *Даждьбог, Ярыла, Хорс, Сварожыч* пісаў А.Багдановіч */Багдановіч,5-6/.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Купалле
**VI**
Сёмуха Зажынкі
**V** **VII**
Юр’я Дажынкі
**IV** **VIII**
Вялікдзень Багач
**III** **IX**
Благавешчанне Дзяды
**II** **X**

Маслянка Усе святыя
**I** **XI**
**XII**
Каляда

**Купальскія песні**

Рэгіён «класічнага» беларускага купалля – Полаччына. Як акрэслівала Л.С.Мухарынская – песні беларускага сонцастаяння вядомы на тэрыторыі краіны амаль паўсюдна. Там, дзе ўласна абрадавых не зафіксавана (купальскія песні-балады фіксуюць паўсюль) – гэта, хутчэй за ўсё, знітавана з уплывам служкаў хрысціянскіх канфесій (каталікоў на гродзеншчыне) ці сектаў (рускіх старавераў на веткаўшчыне). Не вельмі пісьменныя святары і актывісты-вернікі з абрадавымі праявамі купалля мэтанакіравана змагаліся і таму адпаведных песень тут цяжка адшукаць, асабліва зараз. Купальскія песні спявалі збольшага жанчыны і дзяўчаты.

Такім чынам, беларускі каляндарна-земляробчы рэпертур перыяду летняга сонцастаяння складаюць песні к у п а л ь с к і я (*купалкі, купалінкі, купальныя*), якія непасрэдна звязаны з са святкаваннем купалля і з’яўляюцца абрадава значнымі, а таксама песні п я т р о ў с к і я, якія выконваюцца на касавіцу. Яны цесна пераплецены паміж сабой, іх тыпавыя напевы ў традыцыйнай музычнай практыцы розных мясцовасцей часцей за ўсё агульныя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для рускай песеннай традыцыі (за выключэннем сумежных з намі Пскоўшчыны, Смаленшчыны, Браншчыны) яны ў цэлым не характэрныя; на Украіне – развітыя ў рытмічных формах, вельмі набліжаных да беларускіх. Купальская абрадавасць і песні балтаў (летнесонцаваротныя святы Ligo латышоў, Kupolė, Kupolių šventė літоўцаў) гавораць пра агульнасць купальскай песеннай традыцыі ва ўсходнееўрапейскім фальклоры, яе не толькі выключна славянскай прыродзе. Нават этымалогію слова ‘купала’ некаторыя даследчыкі выводзяць ад ‘Kybela’ – багіня-маці ў балканскіх і малаазійскіх народаў часоў антычнасці. З гэтымі народамі часам звязваюць этнагенез славян.

Шырокія групы тэкстаў аб’яднаны тэмамі чарадзейства, ведаўства і замоў, адлюстроўваюць звычай збірання купальскіх зёлак. Шырока вядомы т.зв. купальскія балады-міфы: аповяды пра паходжанне кветкі “купалка” ад інцэстуальных заляцанняў брата да сястры ці маці. Тэксты такога тыпу аб’яднаны ў сюжэтныя групы “удава і сыны-карабельнікі”, “браткі”. Тэматыка гэтых міфаў, як і семантыка ўсей абраднасці Дня сярэдзіны лета знітавана з матывамі шлюбнага яднання-адзінаборства супрацьлеглых стыхій – неба і зямлі.

Сведчанне абрадавай прыналежнасці купальскіх песень – іх устойлівыя рэфрэны: “Купала”, “Купала на Йвана”, “Іграй сонца да з зарою”, “То-то-то”. Тыповым з’яўляецца антыфон у пабудове самога напеву.

Тактаварытмічнай сістэмы ў купальскіх песнях няма. Яны выконваюцца адвольна. Тактавая альбо пункцірная рыска ў запісах пазначае рытмічную перыядызацыю квантытатыўных напеваў. Найбольш характэрнымі на думку даследчыкаў з’яўляюцца наступныя песенныя тыпы.

“дзевяцісkладовік” – ♩ ♩ ♩ o ♩ | ♩ o ♩ o ;

“з абрамленнем” – ♩ ♩ o ♩ ♩ o | ♩ ♩ ♩ ♩ ♩ ♩ ♩ ♩ | ♩ ♩ o ♩ ♩ o ;

“то-то-то: 3 + (5 + 5) + 3” – ♩ o o | ♩ ♩ ♩ ♩ o | ♩ ♩ ♩ ♩ o | ♩ o o ;

“5 + 3” – ♪ ♪ ♪ ♩ ♪ | ♪ ♩ ♩ ;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“семіскладовік з зацягнутым апошнім слогам” – ♪♪♪♪♪♪ ♩.

Усяго вылучаюць ад 7 да 9 асноўных мелатыпаў.

У мелодыка-інтанацыйных адносінах цыкл купальскіх шырока звязаны з песнямі веснавога прымеркавання: безрэфрэнныя тэрцавыя і тэрца-квартовыя купальскія напевы, напевы з выгукамі “Гу!”.

Некаторыя групы песень маюць сувязь з інтанацыямі жніва (№1 – дзевяціскладовік), вяселля.

**Жніўныя песні і этнафонія**

Жніўныя песні – каляндарныя і працоўныя адначасова (іх класіфікуюць як *каляндарныя* ў працах беларускіх этнамузыколагаў і як *працоўныя* ў кнігах, напрыклад, па літоўскаму фальклору). Лічаць, што земляробства на тэрыторыі Беларусі прынеслі на мяжы III / II тыс.да н.э. балцкія плямёны. Напэўна таму беларускія жніўныя песні маюць шмат агульнага са жніўнымі Літвы. Палякі і расіяне песень на жніве не маюць, захавалі толькі дажынкавыя. Жніўныя ўкраінцаў і латышоў на беларускія і літоўскія не падобны.

Усе музыказнаўцы падкрэсліваюць стражытнасць напеваў жніва, і, адпаведна, іх уплыў на лексіку і стыль традыцыйных беларускіх спеваў. Жніўныя песні тэарэтычна маглі з’явіцца ў час з’яўлення земляробства на беларускіх землях, а гэта – перыяд V – IV – III тыстыс. да н.э. Магчыма, таму іх этнафонія так складана для пераймання, чалавеку, не далучанаму да традыцыі.

Для ўсіх збольшага жніўных беларускіх песень характэрны: рытмічная імправізацыйнасць; шчодрая мелізматыка і элементы рубатнасці, імправізацыйнасці пры выкананні.

Этнографы, этнамузыколагі і мастацтвазнаўцы выдзяляюць тры асноўныя, найбольш буйныя функцыянальна-жанравыя групы жніўных песень.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Групы жніўных песень

| Жніўныя песні | | | |
|---|---|---|---|
| з а ж ы н а ч н ы я | п е с н і   н а   ж н і в е: у час перапынкаў у працы, у час працы, увечары па дарозе дахаты | | д а ж ы н а ч н ы я |
| Арэалы бытаваннд | | | |
| Заходнія і паўднё-ва-заходнія раёны | Паўсюль на Беларусі | | Поўнач Беларусі |
| Асаблівасці | | | |
| Рэфрэны:<br>Плён нясём, плён !<br>Збор, жыта збор ! | Поўнач Беларусі:<br>- Манодыя нават пры гуртавым выкананні;<br>- няспешная, лірычная манера спеваў;<br>- ладавая і кампазіцыйная разнастайнасць; | Поўдзень Беларусі:<br>- гетэрафоннасць пры гуртавым выкананні;<br>- напружанасць і агрэсіўнасць гучання;<br>- усе – варыянты адной матры-цы-формулы; | Звароты да Раю і Спарыша (каласоў, што зрасліся парай) |

Спевы на жніве – рытуальная асаблівасць беларускай традыцыйнай культуры. Па даследаваннях навукоўцаў, спявалі ў час працэсу жніва далёка не ўсе вясковыя спявачкі. З.Мажэйка спецыяльна пазначала, што найбольш арганічна і з бясспрэчнай функцыянальнай патрэбай (г.зн. дапамагаючы) яны гучалі ў час працы т.зв. «адмысловых» спявачак. «Звычайныя» спявачкі збольшага працавалі без спеваў, спявалі ў адпачынках і па дарозе дахаты.

Ладавыя асаблівасці жніўных песень. Асноўная формула жніўных песень Палесся, якую вылучыла З.Эвальд – т э р ц о в ы лад з субквартай, у якім пасля вельмі доўгага фермата ўстою – вярчэне ў межах тэрцыі ўгору ад яго. Для крайняга захаду Беларусі характэрны к в і н т а в ы я жніўныя напевы. На поўначы і паўночным захадзе Беларусі адкрэсліаюць т э т р а х о р д а в ы я напевы.

Метрычныя асаблівасці жніўных песень. Для выканання песень жніва ўвогуле характэрна *вольная* метрыка, чаргаванне зацягвання асобных таноў, на якіх робяць апору, з паскоранымі пераходамі праз неапорныя таны. Выключэннем з’яўляюцца – адчуўшыя ўплыў карагоднай культуры рытмічна арганізаваныя жніўныя Магілёўшчыны:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

♪♪♪♪ ⌡ ♪ ⌡ ; ♪♪♪♪⌡⌡ 0 ; ♪♪♪♪♪⌡⌡ 0;

жніўныя песні беларускай поўначы тыпу А + Б + В + А:

♪♪ ⌡ 0 | ♪♪♪♪ ⌡ ⌡ |♪♪♪♪ ⌡ ⌡ | ♪♪ ⌡ 0..

## 3. ЭТНАФОНІЯ ВОСЕНЬСКАГА ЦЫКЛА

**Пытанні па тэме**

- Восень у традыцыйным календары
- Восеньскія песні і этнафонія

**Літаратура па тэме**

*Восточнославянский* фольклор: слов. науч. и нар. терминологии / Редкол.: К.П.Кабашников (отв. ред.) и др. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – С. 178 – 200.

*Варфаламеева, Т.Б.* Песні Беларускага Панямоння / Т.Б. Варфаламеева /Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 287 с.

*Можейко, З.Я.* Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт систем.-типол. исслед. / З.Я. Можейко. – Мінск : Наука и техника, 1985. – 247с.

*Хейзинга, Й.* Homo ludens. В тени завтрашнего дня / Й. Хейзинга; пер. с нидерланд. и примеч. В.В. Ошиса ; общ. ред. и послесл. Г.М. Тавризян. – М. : Прогресс : Прогресс-Академия, 1992. – 464 с.

*Чистов, К.В.* Народные традиции и фольклор / К.В.Чистов. – Л. : Наука, 2008. – С. 174 – 184.

**Восень у традыцыйным календары**

Апасля летняга сонцавароту працягласць дня пачынае змяншацца ў кірунку *ЗСС.* І ў дні, блізкія да *восеньскага раўнадзенства,* а дзе-нідзе і ўласна 21 верасня, святкавалася апошняе са святаў "Сонечнага крыжа" - старажытнае свята заканчэння ўборкі зерневых - Багач, у хрысціянскія часы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прымеркаванае да Раства Багародзіцы. Увага да зямлі адлюстравана і ў свяце пахаваных у ёй продкаў – Дзядах, якое у хрысціянскія часы было прымеркавана да пачатку кастрычніка. Магчыма, некалі гэтыя святы былі аб’яднаны. Ланцуг святаў працягвае рухацца ў напрамку Калядаў, каб у іх завяршыць кола старога года .

**Восеньскія песні і этнафонія**

Восеньскія песні характэрны для ўсёй Беларусі, але канцэнтруюцца пераважна на Паазер’і. Яны складаюць прыналежнасць ж а н о ч а г а і д з я в о ч а г а песеннага рэпертуару. Іх лічаць адметным узорам песеннай л і р ы к і беларускай традыцыі.

Перыяд гучання восеньскіх песень – ад заканчэння дажынак ( ) да пачатку шасцітыднёвага піліпаўскага паста (27 лістапада). Народныя назвы восеньскіх песень: «ярынныя», «авясец», «ільнавыя», «ягады беручы», «як мнуць проса» і г.д. Большасць груп восеньскіх песень (песні пры уборцы грэчкі, ярынныя, ільнавыя і г.д.) знітаваны з сезоннымі відамі земляробчай працы. Літоўскія фалькларысты класіфікуюць іх як «працоўныя». Тыпы напеваў і вобразны змест некаторых восеньскіх вельмі падобны на Беларусі і ў Літве.

Напевы восеньскіх маюць менш жорсткае прымеркаванне да сезона, чым іншыя каляндарныя, часцяком – яны не формульныя, з вольнайрытмікай і ладавай сістэмай. Многія з восеньскіх увогуле надзвычай індывідуалізаваныя і развітыя па меладычным распеве, іх лічаць прыкладам песеннай індывідуальнай лірыкі, паколькі збольшага іх выконвалі сольна, самавыяўляліся і “спеўна выказваліся” пра сваё жыццё, яго праблемы і дасягненні. На восеньскіх кірмашах спецыяльна збіраліся, каб паслухаць лепшых спевакоў наваколля.

Меладычны стыль восеньскіх песень шматсастаўны. Па меркаванні этнографаў, этнамузыколагаў і мастацтвазнаўцаў, ён спалучае тры наступныя выразна акрэсленыя мелодыка-стылявыя сферы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя групы восеньскіх песень

| **Восеньскіе песні** | | |
|---|---|---|
| **Яравыя, «Авясец»** | **Ільнавыя** | **Восеньскія позднe-традыцыйнага складу** |
| Паазер'е | паўночны захад Паазер'я паўднёвы захад Беларусі | Гомельшчына, поўдзень Магілёўшчыны |
| Найбольш глыбінны слой каляндарнай восеньскай мелодыкі | Манадыйны меладычны склад:раннетрадыцыйнае музычнае мысленне | Пераўтварэнне раннекла-січнага стылю: шматгалоссе |
| Маюць сувязь з традыцыяй вясельных песень | Фіксацыя фактаў і назіранняў | Псіхалагізацыя вобраз-нага зместу тэкстаў |
| Пераважна квінтавыя лады | Тэрцавыя і тэтрахордавыя лады з субквартай, квінтавыя лады | Індывідуальна акрэсле-ныя меладычныя звароты |
| 8-складовы вершаваны радок «5 + 3» | Падвоены 4-складовы радок «4 + 4 + 4 + 4» | Супастаўленне запеву са складанай рытмікай і строга аднамернага харавога падхвату |
| ♪♪♪♪ ♩ \| ♪♪ ♩<br>я не жы та жну я ры ну | ♪♪ ♩♩ \| ♪♪♪♪♪♪♪♪ \| ♪♪ ♩𝅗𝅥 | |
| Найбольш вядомыя тэкставыя зачыны | | |
| «Авясец, матуля, авясец» | «Брала дзеўка ляночак» | «Ой закаціся жаркое сонейка» |

Згодна Л.С.Мухарынскай, мелодыка восеньскіх песень – вынік працэсу пераўтварэння раннекласічнага меладычнага стылю. Яна падрыхтавана гістарычным развіццём гэтага стылю і фіксуе этап станаўлення непрымеркаванай лірычнай песні.

## 4. СЯМЕЙНА-АБРАДАВЫ ПЕСЕННЫ ЦЫКЛ

**Пытанні па тэме**

- Сямейныя абрады і іх музычнае аздабленне
- Радзінныя песні і этнафонія
- Вясельныя песні і этнафонія
- Пахавальныя галашэнні і іх этнафонія

**Літаратура па тэме**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Восточнославянский* фольклор: слов. науч. и нар. терминологии / Редкол.: К.П.Кабашников (отв. ред.) и др. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – С. 178 – 200.

*Хейзинга, Й.* Homo ludens. В тени завтрашнего дня / Й. Хейзинга; пер. с нидерланд. и примеч. В.В. Ошиса ; общ. ред. и послесл. Г.М. Тавризян. – М. : Прогресс : Прогресс-Академия, 1992. – 464 с.

*Чистов, К.В.* Народные традиции и фольклор / К.В.Чистов. – Л. : Наука, 2008. – С. 174 – 184.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Сямейныя абрады і іх музычнае аздабленне

У жыцці кожнага чалавека ва ўсіх культурах даследчыкі вызначаюць тры галоўныя моманты: нараджэнне, шлюбаванне, смерць. Яны лічыліся пераходнымі кропкамі (ініцыяцыямі) і рытуальна аздабляліся, у тым ліку і з дапамогай этнафоніі.

У традыцыйнай культуры беларусаў гэта аздабленне прадстаўлена радзіннымі, вясельнымі песнямі і пахавальнымі (ці хаўтурнымі) галашэннямі. Дзве першыя групы – часам спалучаліся з інструментальнымі найгрышамі (у першую чаргу – скрыпкай, дудой, цымбаламі, бубнам ці барабанам), трэцяя існавала выключна акапэльна.

## Радзінныя песні і этнафонія

Асноўная частка радзінных песень – велічальныя ці застольныя. Яны выказваюць добрыя пажаданні бацькам і дзіцяці. Вялікая група песень – жартоўныя, асноўныя персанажы якіх – бабка (павітуха), кум і кума і іх узаемаадносіны, якія пераасэнсоўваюцца ў жартоўна-сатырычным плане. Часам бацьку немаўляці называюць кавалём, што адсылае да вельмі архаічнай міфалагічнай сімволікі.

Спецыфічная музычная характэрнасць у радзінных песнях – з’ява не паўсюдная. Адмысловыя з іх маюць адзнакі як застольна-бяседных, іншыя – скокавых. Некаторыя спалучаюць адзнакі першых і другіх.

Музычная характэрнасць у радзінных песнях

| Радзінные песні | | |
|---|---|---|
| Палессе | **Паазер'е** | Панямонне Падняпроўе |
| «Бяседныя» мелодыі, старажытны мелас амаль не захаваўся | Больш самастойныя па стылі і тыпах напевы | |
| | Радзінныя напевы – асобная група з устойлівай стылістыкай, мелодыкай. Найбольш распаўсюджаны квінтавыя напевы тыпу ♪♪ ♪ ♪♪ | |

**Вясельныя песні і этнафонія**

Супрацьстаўленне сям'і бацькі і радзіны мужа – з'ява, якая адбілася не толькі ў тэкстах, але і ў музычнай арганізацыі напеваў вяселля. Матыў супрацьстаўлення, спаборніцтва – характэрная іх рыса. Часцяком гасцёў з боку маладой і з боку маладога садзілі на розных баках застолля. Гэта спрыяла дыялогам-перапевам («песні з адказам», «песні на зрэзку»). На вяселлі ў час выканання песень адзін бок (напр. бок маладой) спявае жартаўлівы зачын, а другі (маладога) з імпэтам адказвае.

Навукоўцы акрэсліваюць наступныя этапы вяселля. Сватанне – заручыны – зборная субота – адзяванне маладога і маладой – пасад – вяселле – развітанне маладой з радзінай – сустрэча маладых у доме маладога – перазыўкі.

Мелас традыцыйнага беларускага вяселля спецыфічна афарбаваны парэгіянальна, але захоўвае свой каларыт паўсюль: на Падзвінні, Падняпроўі, Палессі і Панямонні.

Кожная вясельная дружына беларусаў старажытнасці (і маладога, і маладой) мела свайго музыку, які ёй акампанаваў, звычайна – дудара ці скрыпака.

Навукоўцы адзначаюць ўстойлівасць і асобы характар квінтавага інтанацыйнага комплексу вясельных мелодый. Побач з найбольш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пашыранымі квінтавымі напевамі пашыраны і іншыя інтанацыйна-ладавыя разнавіднасці.

Пашыранасць неквінтавых інтанацыйна-ладавых узораў вясельных напеваў

| Інтанацыйна-ладавыя узоры вясельных напеваў | | |
|---|---|---|
| Усх.Палессе | Брэсцкае Палессе | Уздоўж заходняй мяжы |
| тэрцовыя | Секундавыя | Тэтрахордавыя |
| Эвальд,1979, №14-15; Можейко,1983,вып.1, №135, 137, 139, 141. | | Мухарынская&Якіменка, 1993, 105 (№10) |

Дзве асноўныя разнавіднасці рытміцы напеваў вяселля

| Рытміка напеваў вяселля | |
|---|---|
| Дэкламацыйна свабодныя | Перыядычная арганізацыя рытму |
| Элементы рытмічнай імправізацыі | Найбольш паказальныя – пяціскладовікі ♪ ♪♪ ♪ ♪ ці ♪♪♪♪ ♪ |

Найбольш вядомыя вясельныя песні Беларусі таксама характарызуюць як «3+2» ці «4+2». Напрыклад: ♪♪♪♪ ♪ / ♪♪ ♪ ці ♪♪♪♪ ♪ ♪ / ♪♪ ♪.

**Пахавальныя галашэнні і іх этнафонія**

Лічыцца, што старажытныя родавыя плачы былі калектыўнымі: складаліся з воклічаў усіх удзельнікаў пахавальнага абраду. Сольная ж традыцыя склалася ў часы грамадскага і сямейнага побыту.

Некаторыя з плачаў-галашэнняў пазней ператварыліся ў песні, сталі прыдатнымі дзеля масавага выканання. Часцей аднак прадстаўлены адзіночныя пахавальныя галашэнні. Па ацэнках народных спявачак, галашэнне – не спевы, а форма выгаворвання гора. Манера інтанавання галашэння строга рэгламентаваная ў кожнай мясцовасці.

Стылі інтанавання пахавальных галашэнняў

| Пахавальныя галашэнні | | |
|---|---|---|
| Напеўна-рэчытатыўны | Размоўны | Песенны |
| Паўсюдна | Пн.зах. Гродзеншчына | Цэнтральнае Палессе |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5. АБРАДАВЫЯ І ПРЫМЕРКАВАНЫЯ ПА ЧАСЕ І АБСТАВІНАХ ВЫКАНАННЯ КАРАГОДЫ І ГУЛЬНІ

***Пытанні:***

- Карагоды
- Фальклор як сродак выхавання
- Структура і асаблівасці дзіцячага фальклору беларусаў.
- Калыханкі і забаўлянкі, дзіцячыя песні
- Заклічкі і прыгаворы, дражнілкі
- Гульні

***Літаратура:***


Дзіцячы фальклор / укл. Г.А.Барташэвіч, укл. муз. часткі В.Ялатаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972.

Мажэйка, З. Я., Варфаламеева, Т.Б. Песні Беларускага Падняпроўя / З.Я. Мажэйка, Т.Б. Варфаламеева /Нац. Акад. навук Беларусі. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларуская навука,1999. – 392 с.

Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт систем.-типол. исслед. / З.Я. Можейко. – Мінск : Наука и техника, 1985. – 247с.

Мажэйка, З. Я. Песні Беларускага Паазер'я / З.Я. Мажэйка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 494 с., нот. іл.

Можейко, З.Я. Песни Белорусского Полесья / З.Я. Можейко. – М. : Советский композитор, 1983. – 120 с.

Хейзинга Й. Homo Ludens; Статьи по истории культуры /Й.Хейзинга / пер., сост. и вступ. ст. Д.В. Сильвестрова; коммент. Д.Э. Харитоновича. – М.: Прогресс-Традиция, 1997. – 416 с.

Беларускі дзіцячы фальклор http://www.nastaunik.info/node/13262


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Карагоды

Карагоы ісеуюць паўсюль на Беларусі. Складаюць прыналежнасць усёй спеўнай суполкі. У розных рэгіёнах – розныя суадносіны ўласна песеннага і карагодна-песеннага пласта. На Паазер’і, Палессі і Панямонні песенны і карагодны комплексы разгортваюцца паралельна, на Падняпроўі – роля карагоднай плыні больш важкая, дамінуючая. Фактычна, уся песенная культура Магілёшчыны пабудавана на карагодных рытмаформулах і інтанацыях.

Выконваюцца карагоды пачынаючы з Маслянкі, вельмі пашыраны на Зялёныя святкі, Юр’я, Купалле. Заўсёды носяць рытуальную функцыю – ў вясну “тапталі” (абуджалі) зямлю, на Тройцу і Юр’я (абыходзячы вакол вёски) – акрэслівалі (засцерагалі) жыццёвую прастору ад ліха.

Варыянты карагодаў: “сценка на сценку”, “шэсце”, “кола”, “крывы танок”. Звычайна заводзяць карагоды супраць гадзіннікавай стрэлкі – “па сонцу” (рух Сонца па экліптыцы – *гарызонту, яки бачны* – напрацягу севтввой часткі сутачнага цыклу).

Найбольш распаўсюджаныя карагодныя рытмаформулы: так званыя “проса” **♪♪♪♪ ⌋ ♪♪ | ♪♪ ⌋** і “страла” **♪♪ ⌋♪♪ | ♪♪ ⌋♪♪ .** Яны часцяком сустракаюцца і не ў карагодных песнях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Фальклор як сродак выхавання**

Дзіцячы фальклор адыгрывае важную ролю ў жыцці кожнага народа як дзейсны сродак выхавання. Ён суправаджае дзіця з першых дзён з’яўлення на свет, калі маці спявае яму калыханкі, забаўляе яго, і пазней, калі лічылкі становяцца неад’емным кампанентам розных дзіцячых гульняў, а дражнілкі — адным са сродкаў барацьбы з праціўнікам. Дзіцячы фальклор праз паэтычныя вобразы знаёміць дзіця з навакольным светам, дапамагае яму спасцігаць асноўныя прынцыпы ўзаемаадносін у соцыуме. У паэтычнай творчасці народа дзіцячы фальклор да гэтага часу ўяўляе сабой жывую з’яву, якая захоўвае і тэндэнцыю далейшага развіцця, і свае важнейшыя функцыі — пазнавальную, выхаваўчую, эстэтычную. Сучасная ўласна дзіцячая творчасць выконвае таксама функцыю забаўляльную, што грунтуецца на традыцыях народнай смехавай культуры, і камунікатыўную.

У дзіцячым фальклоры, у якім зніттаваны пачаткі спеваў, маўлення, пластыкі, харэаграфіі – шмат у чым вызначана, як чалавек, калі вырасце будзе размаўляць, рухацца (які ў яго будзе т.зв. «сенсітып»), як ён будзе рэагаваць на мастацтва, на дабрыню, на несправядлівасць і г.д.

Адна з асаблівасцей дзіцячага светаўспрымання — надзвычайная эмацыянальнасць — уплывае на характар і тэматыку творчасці дзяцей і падлеткаў, робіць дзейсным і прадуктыўным працэс этнакультурнага выхавання сродкамі фальклору.

**Структура і асаблівасці дзіцячага фальклору беларусаў**

Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што спецыфічнага дзіцячага фальклору не існуе, маўляў: дзеці круціліся вакол дарослых, сёе-тое ад іх пераймалі, пераасэнсоўвалі і ўзнаўлялі.

Разам з тым, звычайна ўсе структурна падзяляюць дзіцячы фальклор на: а)творы вуснай традыцыі, што выконвалі для дзяцей; б) творы вуснай традыцыі, якія выконваюць самі дзеці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Структура дзіцячага фальклору беларусаў

| Творы для дзяцей | творы, якія выконваюць самі дзеці | | | |
|---|---|---|---|---|
| Калыханкі і Забаўлянкі | Дзіцячыя песні | Заклічкі і прыгаворы | Дражнілкі | Гульні |

**Калыханкі і забаўлянкі, дзіцячыя песні**

Калыханкі і забаўлянкі выконвае немаўляці маці, часам – старэйшая сястра, якой у традыцыйнай культуры часцяком даводзілася даглядаць малодшых. Забаўлянкі суправаджаліся казытаннем, лёгкім падкідваннем, дактыльным кантактам, што неабходна для развіцця каардынацыі і рухавых навыкаў дзяцей.

Дзіцячыя песні часам звязаны з удзелам дзяцей у каляндарных святах (напр. у калядных абыходах), дзе яны маглі самапраявіцца як выканаўцы і атрымаць пачастунак і заахвочванне. Часам – дзіцячыя песні проста апавядальныя, апісваючыя свет дзяцей. Звычайна ім характэрна акцэнтаваная рытміка і афарыстычнасць.

| Прыклады | | |
|---|---|---|
| *калыханкі* | *забаўлянкі* | *дзіцячыя песні* |
| Пайшоў каток<br>Пад масток,<br>Злавіў рыбку<br>За хвасток.<br>Ні самому есці,<br>А ні дзеткам несці.<br>А-а, люлі!<br>***<br>Апсік, каток,<br>Не бурчы,<br>Маіх дзеткаў<br>Не будзі,<br>А-а, люлі! | — Чыкі-чыкі, паненачка,<br>Чаму така маленечка?<br>— Мяне брат гадаваў,<br>Хлеба-солі не даваў:<br>Каб вяліка не расла,<br>Каб я замуж не пайшла,<br>Каб вяселле не спраўляць,<br>Каб пасагі не даваць.<br>***<br>Ішлі козы рагатыя, багатыя:<br>— Каго пападу, таго забаду!<br>Аксютку папалі,<br>Аксютку забадалі:<br>Будык-будык-будык! | Калядачкі далёка,<br>Кілбасачкі высока.<br>Калядачкі прыблізіліся –<br>Кілбасачкі паніжыліся.<br>***<br>Куды едзеш, Рамане?<br>Ой, вір-вір, бом-бом! *<br>— На кірмаш, маспане.<br>— А што вязеш, Рамане?<br>— Воз дзяўчат, маспане.<br>— Пачом цэніш, Рамане?<br>— Па чырвонцу, маспане.<br>— Куды едзеш, Рамане?<br>— На кірмаш, маспане.<br>— А што вязеш, Рамане?<br>— Воз хлапцоў, маспане.<br>— Пачом цэніш, Рамане?<br>— Па талеру, маспане. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Заклічкі і прыгаворы, дражнілкі**

Заклічкі гучалі, калі дзеці звярталіся да некага (сябра ці хатняй жывёлы), каб наладзіць эмацыйны кантакт, пагуляцца. Прыгаворы – ахарактарызаваць нейкую тыповую сітуацыю, якую трэба выправіць.

Дражнілкі выкарыстоўвалі, калі некаму трэба было даць адпор, абсмяяць, абараніцца.

Выдзяляюць наступныя найбольш характэрныя прыклады гэтых форм дзіцячага самавыяўлення ў фальклоры беларусаў.

| Прыклады | | |
|---|---|---|
| *заклічкі* | *прыгаворы* | *дражнілкі* |
| Коцік-абармоцік,<br>Доўгія вусікі,<br>Тоўсценькія лапкі,<br>Ходзіць без шапкі. | Дзед пайшоў у грыбы,<br>А баба ў апенкі,<br>Дзед свае прасушыў,<br>А бабіны макрэнькі.<br>— А дзед-дзядулінька,<br>А йдзе твая бабулінька?<br>— Нету, нету, да няма ж,<br>Паехала на кірмаш.<br>А ці чорт яе панёс,<br>Не падмазаўшы калёс. | Бацян даўганосы<br>Прапіў боты і галёшы,<br>А сам босы<br>Топчаш росы.<br>***<br>У імя атца і сына і святога духа!<br>Ёсць у печы саладуха.<br>Трэба ў печ улезці,<br>Саладуху з'есці. |

**Гульні**

«…Гульня ёсць перш за ўсё і ў першую чаргу свабоднае дзеянне. Дзіця ці жывёла гуляюць, бо чэрпаюць у гульні задавальненне, і ў гэтым як раз і складаецца іх свабода», – пісаў нідэрландскі культуролаг і філосаф Йохан Хейзінга.

У дзіцячых асяродках беларусаў бытавалі самыя разнастайныя гульні: каляндарныя гульні (“Яшчар”, “Жалімон”, у якія гулялі на Каляды; “Цяцерка” – на Купалле і інш.);

блізкія да танцаў гульні з рухамі і інвентаром (“Мікіта”, “Зайчык-чыбірайчык”);

гульні са спартыўнымі элементамі, дзе трэба была праявіць часам недзіцячую моц і спрытнасць (“Шуляк”, “Грунвальд”).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Гульня “У зайца”

Збіраецца шмат дзяцей. Усе дзеці (і хлопцы, і дзяўчаты) бяруцца за рукі і ўтвараюць кола. Два хлопчыкі стаяць асобна. Гэта – хорт і заяц. Хорт павінен лавіць зайца. Дзеці, якія ўтвараюць кола, пускаюць зайца ў сярэдзіну, падняўшы рукі ўгору, калі ён уцякае ад харта, а харта затрымліваюць, апусціўшы рукі долу, калі хорт ганіцца за зайцам.

Калі хорт зловіць зайца, усе разрываюць кола і кідаюцца на харта, які, паваліўшы зайца на зямлю, душыць яго. Тут смех, гуканне, бегатня. Потым выбіраюць новага зайца і харта і гульня пачынаецца нанова.

Гуляюць, пакуль зайцамі і хартамі не перабываюць усе ўдзельнікі, ці пакуль не надакучыць, альбо сцямнее.

## Гульня “Явар”

Выбіраюць дваіх “на вароты”, астатнія бяруцца за рукі, як у карагодзе, і ходзяць васьмёркай, падымаючы рукі ўгору, каб можна было прайсці.

Пры гэтым спяваюць: «Явар, яваравы людзі, //Што вы тут рабілі? // — Мы рабілі моста //На пана староста, //Цешычкамі запускалі, //Аднаго нам астаўлялі. //Перша капуста, //Друга распуста. //Перша малявана, //Друга затрымана».

На слове “затрымана” запыняюць апошняга і пытаюцца: “Ты куды ідзеш – управа ці ўлева?” (або на выбар два розныя колеры, два дрэвы і г.д.)

Затрыманы ў залежнасці ад адказу становіцца за тым ці іншым на варотах. Потым дзве групы, якія атрымліваюцца ў выніку апытання, мераюцца сілаю.

На гэтым гульня канчаецца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 6. ПАЗААБРАДАВАЯ ПЕСЕННАЯ ЛІРЫКА

**Пытанні па тэме**

- Структура пазаабрадавага фальклору.
- Песні з умоўным прымеркаваннем па часе і абставінах выканання.
- Познетрадыцыйная класіка песень.

**Літаратура па тэме**

Балады. У 2 кн. / склад. Л.М.Салавей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1977–1978.

*Касцюкавец, Л.* Беларускія канты / Л.Касцюкавец. – Мінск : Бел ІПК, 1991.

*Можейко, З.Я.* Песни Белорусского Полесья / З.Я. Можейко. – М. : Советский композитор, 1983. – 120 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Структура пазаабрадавага фальклору

Раннетрадыцыйная класіка песень акрамя неаддзельных ад абрадавых дзеянняў і рытуалаў абрадавых і працоўных песень уключае ўмоўна прымеркаваныя песні (паставыя песні і духоўныя вершы, балады). Як і календарны фальклор, гэта – даволі архаічныя жанры фальклору, якія маглі зарадзіцца ў неаліце і эпохе металу, а аформіцца ў Сярэднявеччы. Таму, паводле аналізу фалькларыстаў, па напевах і светаадчуванні іх тэкстаў, гэта – яшчэ раннетрадыцыйная класіка вуснай паэзіі беларусаў.

У XVII, XVIII, XIX стагоддзях з’явіліся песні, якія завуць позднетрадыцыйнымі (познетрадыцыйнай класікай песень) – чумацкія, рэкруцкія і канты. Іх далучаюць да класікі песень беларусаў. Умоўна прымеркаваныя і позднетрадыцыйныя песні не звязаны з рытуальнымі дзеяннямі, таму іх называюць пазаабрадавымі ці пазаабрадавай лірыкай беларусаў.

### Песні з умоўным прымеркаваннем па часе і абставінах выканання

**Паставыя песні.** Хоць яны і знаходзяцца ў арбіце каляндарнага цыклу, аднак у функцыянальных адносінах да каляндарных не належаць. Спяваюць іх у 6-тыднёвы (піліпаўскі) пост перад Калядамі і 7-тыднёвы (вялікі) пост перад Вялікаднем.

Песні паставога перыяду «не голасныя». Часцей за ўсё іх кваліфікуюць як «доўгія», «сапраўдныя», «колішнія», «перасказваючыя». Месца іх гучання ў піліпаўку – памяшканне, дзе збіраліся жанчыны за доўгай хатняй працай.

Акрамя піліпаўскіх выкананняў «за кудзеляй» (за працай) такія песні выконвалі ў вялікі пост вандроўныя музыкі-лірнікі. Яны спявалі песні пад акампанемент калёснай ліры. Звычайна гэта былі людзі альбо ва ўзросце, якія ўжо не маглі зарабіць сабе на жыццё працай на гаспадарцы, альбо сляпыя з дзецьмі-павадырамі. Сяляне заўсёды ставіліся да такіх выканаўцаў з павагаю.

Адна з галоўных адзнак паставых песень – прыналежнасць да міфаў. У беларускай фалькларыстыцы нават ужываецца дэфініцыя «балады-міфы». Галоўная прыкмета міфа – тлумачэне паходжання з'яў прыроды і культуры. Міф– апавяданне, дзе тлумачыцца як з'явіліся нейкія дрэвы, расліны, рэкі; дзе распавядаюць, чаму ўсталяваліся менавіта такія адносіны паміж людзьмі (перасталі ахвяраваць дзяўчын, сталі слухацца старэйшых).

Групы паставых песень

| Паставыя песні | | |
|---|---|---|
| Навелістычныя | Героіка-эпічныя | Духоўныя вершы |
| Навелістычныя і прыгодніцкія сюжэты | Змеяборства | Хрысціянска-рэлігійныя матывы |
| Пра ператварэнне нявесткі (сына) ў дрэва; пра братазабойства; пра сястру і 9 братоў-разбойнікаў | «Цмок» ('цмок' — па-беларуску «дракон») | «Пра багатара» «Лазар» |
| Сюжэты | | |
| Незадаволеная паводзінамі сына (нявесткі) маці (свякруха) атручае альбо зачароўвае маладых у дрэва. Часам дрэва вырастае на магілках забітых і распавядае пра гэтыя падзеі голасам тых, хто пахаваны.<br>Адзін з першых варыянтаў тэкстаў пра сястру і братоў-разбойнікаў запісаў А.С.Пушкін ў Пскоўскай губерніі. Сюжэт з'яўляецца тыповым і дзеля эпічнай традыцыі | Адзінаборства асілка з цмокам. Асілак (Юр'я) забівае цмока, які жыве ў 'моры' вакол зямлі. Цмок да гэтай падзеі перыядычна выкрадаў самых лепшых дзяўчат народа, які яму | Павучальныя апавяданні пра двух братоў (багатага і беднага), якім пасля смерці была адплачана за зямное жыццё: багаты пакараны за сквапнасць і здзекі з беднякоў, а бедны атрымаў пакой і добрую долю. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| рускай Поўначы. | пакланяўся. | |
| Музычныя характарыстыкі | | |
| Песні паставога перыяду «не голасныя». Яны – сваеасаблівая «апазіцыя» гучным каляндарным загуканням. Не формульныя, але часцяком (напрыклад, у паўдзённабеларускай традыцыі: в.Тонеж) многія з балад склаліся ў пэўны мелодыка-стылявы тып. | Маюць вяснова-каляндарную меладычную аснову. Звычайны дыяпазон-сэкста або тэрцовы лад з ніжняй квартай. ♪♪ ♪♪ \|♪♪ ♪♪ | Дэкламацыйнасць, апавядальны рытм. Інструментальныя інтанацыі, што абумоўлена дзейнасцю музыкаў-лірнікаў. |

**Балады.** Балады – песенныя гісторыі-апавяданні: фальклорныя спеўныя творы з вербальным (складзеным са слоў) тэкстам, які з'яўляецца разгорнутым сюжэтным аповядам.

Беларускія баладныя песні па сваёй функцыі ў народным побыце падзелены на ўключаныя ў календырны цыкл і бытавыя.

| Балады | |
|---|---|
| Уключаныя ў каляндарны цыкл | Бытавыя (іх пяюць «абы калі») |
| Веснавыя, купальскія і пятроўскія, восеньскія, піліпаўскія | Бяседныя, рэкруцкія,салдацкія |
| Пераважна жаночы спеўны рэпертуар | Жан. і мужчынскі рэпертуар |
| Балады ў каляндарным песенным пласце – з'ява характэрная дзеля ўсёй Беларусі. Аднак, найбольш поўна яна праявіла сябе на беларускай поўначы (Паазер'і) | |
| Балады каляндарнага цыкла ў кожнай мясцовасці – з тыпавымі раннетрадыцыйымі напевамі. Лад і стыль выканання напеваў адпавядае мясцовай сезоннай традыцыі. | Стылявыя рысы напеваў сведчаць пра больш позняе паходжанне параўнана з каляндарнымі. Яны больш вольныя і гнуткія. |

Назва "б" з'явілася ў творах ангельскіх рамантыкаў XIX ст. Славянскія літаратары перанялі. У ангельскай мове, адкуль і пайшла дэфініцыя "балада" яе выводзяць ад лат. ballare – танчыць. Гэта – верш для танца. Пад шатланскія, валійския і ірланскія балады сапраўды танчылі.

**Познетрадыцыйная класіка песень.** Познетрадыцыйнай класікай песень лічаць чумацкія і рэкруцкія песні, канты.

**Чумацкія песні.** Існуюць на Беларусі з сяр. XIX. Выканаўцы – мужчыны. Фарміраванне асноўнага масіву чумацкіх і батрацкіх песень на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі было знітавана з практыкай так званага *адыходніцтва* і з прыцягнення сялян да працы па найме ў маёнтках буйных зямельных магнатаў (50-я гг. XIX ст.).

Чумакі – мужчыны, што былі вымушаны адпраўляцца на заробкі далёка ад дому і часам на працяглы тэрмін. Асноўныя віды дзейнасці на чужыне – дробны оптавы гандаль бакалейнымі таварамі і сезонныя сельскагаспадарчыя работы. Асноўны від перасоўвання – падводы на валах. Асноўныя тэмы паэтычных тэкстаў чумацкіх песень – адзінота на чужыне, разлука са сваякамі і крэўнымі (роднымі), небяспекі (хваробы, матэрыяльныя праблемы, раптоўная смерць) існавання асобы па-за межамі традыцыйнай суполкі «у міру».

Абнаўленне сродкаў музычнай выразнасці праяўляецца ў залежнасці ад стылю і спецыфікі рэгіянальных мастацкіх традыцый – каляндарных напеваў–стрыжняў. У адрозненне ад практыкі выканання старадаўніх каляндарных ці сямейна-абрадавых мелодый, цяпер стымулам для інтанавання напеваў сталі змест і паэтычны тэкст песні. З прычыны названых асаблівасцей познетрадыцыйныя песні выконваліся за сталом, як успамін пра былыя вымушаныя вандроўкі, выяўляючы думкі і пачуцці, што хвалявалі ўсіх удзельнікаў бяседы – выканаўцаў і слухачоў.

**Рэкруцкія песні.** Зафіксаваны паўсюль на Беларусі. Выконваюць рэкруцкія як мужчыны, так і жанчыны. Узніклі на мяжы XVIII і XIX стст. пасля падзелу Рэчы Паспалітай і далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі*. Першы рэкруцкі набор быў праведзены на беларусі ў 1794 г. у Магілёўскай і Полацкай губерніях. Выклікаў магутныя выбухі пратэсту сярод насельніцтва.

Вайсковая служба ў тыя часы цягнулася 25 год і мусіла быць скончанай раней толькі ў выпадку смерці, ці цяжкага увечча саўдата-рэкрута. У рэкруты маглі забраць, калі прыйшла чарга вёскі даць рэкрута. Забіралі хлопца, які

* Рэч Паспаліта Польска рэгулярнага войску не мела. Баранілася ў час вайны шляхетнай конніцай і народным апалчэннем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выцягнуў «жрэбій», ці на каго паказаў пан ці войт. Калі ў сямьі быў адзіны сын – у рэкруты не забіралі. Натуральна, што лёс рэкрута – праклён і для хлопца, і для крэўных (па-першае, для маці), і для яго дзяўчыны.

Рэкруцкія песні адлюстроўвалі асаблівую абвостранасць трагедыйнага ўспрыняцця чалавекам навакольнага свету. Карціны развітання рэкрута з роднымі і традыцыйныя адказы яго на пытанне пра вяртанне ўяўляюць абагульнёныя вобразы чалавечай безысходнасці.

Назіраецца зрашчэнне рэкруцкіх песень з песнямі казацка-сялянскай вольніцы. Другая важная асаблівасць рэкруцкіх – трывалая сувязь з жывой традыцыяй жаночай каляндарнай лірыкі з уласна лірычнай жаночай песняй, з паэтычнай вобразнасцю жанру лірычных восеньскіх песень.

Побач з салдацкімі песнямі рускага (часткова – украінскага) паходжання на Беларусі сфарміравалася значная колькасць самабытных песень з вайсковага побыту са сваімі тыпова беларускімі сюжэтамі, характэрным вобразна-паэтычным строем, своеасаблівымі рысамі ладавай будовы напеваў. У процівагу «рубленым» рытмам традыцыйных маршаў у іх сустракаюцца 5-складовыя, 7-складовыя тыпы рытмічнай арганізацыі. У беларускі вайсковы рэпертуар пранiклі і набылі ў ім другое творчае жыццё сюжэты старадаўніх балад, знітаваныя з купальскімі паверямі, веснавым цыклам, асколкі гераіка-эпічных сюжэтаў.

**Канты.** Росквіт кантавага мастацтва на Беларусі – XVI-XVII стст. На гэты час прыпадае развіццё ва Усходняй Еўропе пісьменніцтва, рэфармацыйнага руху. Такія плыні Рэфармацыі як кальвінізм актыўна падтрымлівалі буйныя беларускія магнаты – Радзівілы.

Кантавы спеў – традыцыя царкоўна-каталіцкіх і цывільных харавых песень-гімнаў. Музычныя вытокі апошнх – ў грыгарыянскім харале. Аднак, лацінская мова грыгарыянскіх харалаў паводле ўплыву ідэяў Рэфармацыі ў кантавых спевах была заменена на нацыянальныя мовы яшчэ маладых у XVI ст. еўрапейскіх нацый. А стылем кантавых спеваў стал гамафонна-гарманічны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры талерантным стаўленні ў ВКЛ да розных веравызнанняў канты хутка пранiклi ў спеўны побыт розных страт (слаёў) тагачаснага грамадства. У ХУІ-ХУІІ стагодзях у гарадах і мястэчках ВКЛ былі шырока распаўсюджаны рукапісныя і друкаваныя зборнікі кантаў (*канцыяналы*) на еўрапейскіх мовах (царкоінаславянскай, старабеларускай, лацінскай, чэшскай, нямецкай). Вельмі распаўсюджаны быў канцыянал рэктара пражскага універсітэта Яна Гуса. У канцыяналах былі прыведзены напевы, збольшага ананімныя, з групавым далучэннем паэтычных тэкстаў. У зборнікі ўваходзілі *духоўныя канты*: гімны, харалы, псалмы; *свецкія канты*: філасофскага зместу, антыклерыкальнай накіраванасці, любоўныя і любоўна-эратычныя. Сярод выданняў, што пабачылі свет на Беларусі – “Брэсцкі канцыянал” Яна Зарэмбы и “Нясвіжскі песеннік”.

Музычна канты ўяўляюць сабою трохгалосную харавую партытуру для а) першапачаткова мужчынскага (хлопцы-дысканты і мужчынскія галасы) б) з ХУІІІ – для змешанага хору, дзе сапрана і альт спяваюць у тэрцыю і ім кантрапунктуе бас. Пераважаюць мажорныя мелодыі. Асноўныя памеры – ¾, 2/4, 6/8. Даследчыкі пазначаюць, што спяваліся канты гучна, голасна, з прыгукамі і прыкрыкамі.

Канты ўвайшлі і ў сялянскі музычны асяродак. Яны атрымалі тут адаптацыю, пераасэнсаванне і былі паступова асіміляваныя сялянскім музычным стылем.І такім чынам “фальклярызаваліся”. Разнастайныя формы харавога гімнічнага (кантавага) спеву сталі трывалай часткай беларускай народнай музычнай культуры.

Найбольш поўнае выданне на беларускім матэрыяле – *«Беларускія канты» Ларысы Касцюкавец* .

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ВМК

## 3.1 ВУЧЭБНЫЯ ВЫДАННІ, РЭКАМЕНДАВАННЫЯ МА РБ

Цітоў, В.С. Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Традыцыйна-бытавая культура. Вучэбна-метадычны дапаможнік / В.С.Цітоў. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – 240 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## 4.1 Пералік пытанняў да практычных заняткаў

### Занятак 1

Тэма **НАЙГРЫШЫ ДА ПЕСЕНЬ «БАЗАР», «ЦЯЦЕРКА».**

1. Праслухоўванне аўдыязапісу фальклорнага матэрыяла (найгрышы «Базар», «Цяцерка»).
2. Расшыфроўка музычнага тэксту (найгрышы «Базар», «Цяцерка»).
3. Перайманне фальклорнага матэрыяла (найгрышы «Базар», «Цяцерка»).
4. Праца над манерай выканання (найгрышы «Базар», «Цяцерка»).

*Літаратура*


1. Беларуская народная інструментальная музыка / фоназап., натацыя, рэд. і сістэм. найгрышаў, уступ. арт. і навук. камент. І.Д.Назінай. — Мн.: Навука і тэхніка, 1989. — 655 с.: нот. іл. — (Беларус. нар. творчасць / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору).
2. Беларускі фальклор у сучасных запісах : Традыц. жанры : Мінск. вобл. / Уклад. В. Д. Ліцвінка; Уклад. муз. часткі Г. Р. Кутырова. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 477 с. : іл., нот., іл.
3. Беларускія народныя песні : са зб. П.Шэйна / рэд. У.Дамашэвіч, склад. К.Кабашнікаў. – Мінск : Дзяржвыд. БССР, 1962. – 430с.


### Занятак 2

Тэма **НАЙГРЫШЫ ДА ПЕСЕНЬ «ЮРАЧКА», «ЧАЧОТКА».**

1. Праслухоўванне аўдыязапісу фальклорнага матэрыяла (Найгрышы да песень «Юрачка», «Чачотка»).
2. Найгрышы да песень «Юрачка», «Чачотка»
3. Расшыфроўка музычнага тэксту (Найгрышы да песень «Юрачка», «Чачотка»).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Перайманне фальклорнага матэрыяла (Найгрышы да песень «Юрачка», «Чачотка»).
5. Праца над манерай выканання (Найгрышы да песень «Юрачка», «Чачотка»).

*Літаратура*


1. Музыкальные инструменты мира : энциклопедия. – Минск : ООО «Попурри», 2001. – 320 с.: ил.
2. Беларускі фальклор у сучасных запісах : Традыц. жанры : Мінск. вобл. / Уклад. В. Д. Ліцвінка; Уклад. муз. часткі Г. Р. Кутырова. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 477 с. : іл., нот., іл.
3. Беларускія народныя песні : са зб. П.Шэйна / рэд. У.Дамашэвіч, склад. К.Кабашнікаў. – Мінск : Дзяржвыд. БССР, 1962. – 430с.


**Занятак 3**

**Тэма ПАБУДОВА ПРАГРАМЫ ПРЫ СЦЭНІЧНЫМ ВЫКАНАННІ СПЕЎНАГА ФАЛЬКЛОРУ: «ЛЯВОНІХА».**

1. Праслухоўванне аўдыязапісу фальклорнага матэрыяла (найгрыш «Лявоніха»).
2. Расшыфроўка музычнага тэксту (найгрыш «Лявоніха»).
3. Перайманне фальклорнага матэрыяла (найгрыш «Лявоніха»).
4. Праца над манерай выканання (найгрыш «Лявоніха»).

*Літаратура*


1. Беларуская народная інструментальная музыка / фоназап., натацыя, рэд. і сістэм. найгрышаў, уступ. арт. і навук. камент. І.Д.Назінай. — Мн.: Навука і тэхніка, 1989. — 655 с.: нот. іл. — (Беларус. нар. творчасць / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору).
2. Беларускія народныя песні : са зб. П.Шэйна / рэд. У.Дамашэвіч, склад. К.Кабашнікаў. – Мінск : Дзяржвыд. БССР, 1962. – 430с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Занятак 4

## Тэма НАЙГРЫШЫ ДА ПЕСЕНЬ «ОЙРА», «ЦЯЦЕРКА».

1. Праслухоўванне аўдыязапісу фальклорнага матэрыяла (найгрышы «Ойра», «Цяцерка»).
2. Расшыфроўка музычнага тэксту (найгрышы «Ойра», «Цяцерка»).
3. Перайманне фальклорнага матэрыяла (найгрышы «Ойра», «Цяцерка»).
4. Праца над манерай выканання (найгрышы «Ойра», «Цяцерка»).

*Літаратура*


1. Алехнович, О. М. Дуда, волынка, коза, козица // Восточнославянский фольклор: Слов. науч. и нар. Терминологии / Редкол.: К.П. Кабашников (отв. ред.) и др. – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – С. 63 – 64.
2. Беларуская народная інструментальная музыка / фоназап., натацыя, рэд. і сістэм. найгрышаў, уступ. арт. і навук. камент. І.Д.Назінай. — Мн.: Навука і тэхніка, 1989. — 655 с.: нот. іл. — (Беларус. нар. творчасць / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору).
3. Беларускі фальклор у сучасных запісах : Традыц. жанры : Мінск. вобл. / Уклад. В. Д. Ліцвінка; Уклад. муз. часткі Г. Р. Кутырова. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 477 с. : іл., нот., іл.


## Занятак 5

## Тэма СЦЭНІЧНАЯ АДАПТАЦЫЯ МУЗЫЧНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАГА ФАЛЬКЛОРУ: «КРАКАВЯК».

1. Праслухоўванне аўдыязапісу фальклорнага матэрыяла (найгрыш «Кракавяк»).
2. Расшыфроўка музычнага тэксту (найгрыш «Кракавяк»).
3. Перайманне фальклорнага матэрыяла (найгрыш «Кракавяк»).
4. Праца над манерай выканання (найгрыш «Кракавяк»).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Літаратура*

1. Варфоломеева, Т.Б. Геннадий Цитович / Т.Б.Варфоломеева // Працяг будзе ... – Мінск.: БелДІПК, 2004. – С. 45 – 70.
2. Беларускі фальклор у сучасных запісах : Традыц. жанры : Мінск. вобл. / Уклад. В. Д. Ліцвінка; Уклад. муз. часткі Г. Р. Кутырова. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 477 с. : іл., нот., іл.
3. Беларускія народныя песні : са зб. П.Шэйна / рэд. У.Дамашэвіч, склад. К.Кабашнікаў. – Мінск : Дзяржвыд. БССР, 1962. – 430с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Занятак 6

## Тэма ВЫКАНАННЕ МУЗЫЧНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАГА ФАЛЬКЛОРУ: «ПАДЭСПАНЬ»

1. Праслухоўванне аўдыязапісу фальклорнага матэрыяла (найгрыш «Падэспань»).
2. Расшыфроўка музычнага тэксту (найгрыш «Падэспань»).
3. Перайманне фальклорнага матэрыяла (найгрыш «Падэспань»).
4. Праца над манерай выканання (найгрыш «Падэспань»).

*Літаратура*

1. Беларуская народная інструментальная музыка / фоназап., натацыя, рэд. і сістэм. найгрышаў, уступ. арт. і навук. камент. І.Д.Назінай. — Мн.: Навука і тэхніка, 1989. — 655 с.: нот. іл. — (Беларус. нар. творчасць / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору).
2. Беларускі фальклор у сучасных запісах : Традыц. жанры : Мінск. вобл. / Уклад. В. Д. Ліцвінка; Уклад. муз. часткі Г. Р. Кутырова. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 477 с. : іл., нот., іл.
3. Беларускія народныя песні : са зб. П.Шэйна / рэд. У.Дамашэвіч, склад. К.Кабашнікаў. – Мінск : Дзяржвыд. БССР, 1962. – 430с.

## Занятак 7

## Тэма МУЗЫЧНАЕ СУПРАВАДЖЭННЕ ПЕСЕНЬ «За Сібірам», «Валы мае», «Верабейка», «Ой, чоп-чок на гарэ»

1. Праслухоўванне аўдыязапісу фальклорнага матэрыяла (акампанемент да песень «За Сібірам», «Валы мае», «Верабейка», «Ой, чоп-чок на гарэ»).
2. Расшыфроўка музычнага тэксту (акампанемент да песень «За Сібірам», «Валы мае», «Верабейка», «Ой, чоп-чок на гарэ»).
3. Перайманне фальклорнага матэрыяла (акампанемент да песень «За Сібірам», «Валы мае», «Верабейка», «Ой, чоп-чок на гарэ»).
4. Праца над манерай выканання (акампанемент да песень «За Сібірам», «Валы мае», «Верабейка», «Ой, чоп-чок на гарэ»).

*Літаратура*


1. Можейко З.Я. Песенная культура белорусского Полесья. Село Тонеж. Ред. Е.В. Гиппиус. Мн., Наука и техника, 1971. – 264 с.
2. Беларускі фальклор у сучасных запісах : Традыц. жанры : Мінск. вобл. / Уклад. В. Д. Ліцвінка; Уклад. муз. часткі Г. Р. Кутырова. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 477 с. : іл., нот., іл.
3. Беларускія народныя песні : са зб. П.Шэйна / рэд. У.Дамашэвіч, склад. К.Кабашнікаў. – Мінск : Дзяржвыд. БССР, 1962. – 430с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.2 ЗАДАННІ ДЛЯ КАНТРАЛЮЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ І ГРАФІК ЯЕ КАНТРОЛЮ

*Метадычныя ўказанні для КСРС:*

Выкананне самастойнай работы па курсу прадугледжана тэматычнымі планамі факультэта ТБКіСМ і абавязкова для кожнага студэнта.

Самастойная работа выконваецца ў любой рэкамендаванай форме па адной з тэмаў, якія прыведзеныя ніжэй. Яна павінна мець тытульны ліст, асноўную частку і спіс літаратуры.

Агульны напрамак КСРС :

103 гр. «Азнаямленне з народнымі музычнымі інструментамі»

203 гр. «Спеўны гурт на канцэртах: карыфеі спеўнага фальклору»

303 гр. «Сцэнічная адаптацыя харэаграфічнага фальклору: вакальны і харэаграфічны трэнінг»

*Прыкладныя тэмы для КСРС:*

**103 гр.:**

1. Азнаямленне з народнымі музычнымі інструментамі-аэрафонамі.
2. Азнаямленне з народнымі музычнымі інструментамі-хордафонамі.
3. Азнаямленне з народнымі музычнымі інструментамі-ідэяфонамі.

**203 гр.:**

1. Аўдыя- і відэазапісы выбітных фальклорных канцэртаў Паўночнай Беларусі.
2. Аўдыя- і відэазапісы выбітных фальклорных канцэртаў Паўднёвай Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Аўдыя- і відэазапісы выбітных фальклорных канцэртаў Цэнтральнай Беларусі.

**ГРАФІК КАНТРОЛЮ**

**САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ**

па дысцыпліне **ЭТНАФАНІЧНЫ ПРАКТЫКУМ: КЛАС ФАЛЬКЛОРНА-ВЫКАНАЛЬНІЦКАГА МАЙСТЭРСТВА**

***203 гр. ФТБКСМ***

| **Тэмы** | **даты кантролю** | | | |
|---|---|---|---|---|
| | **Кансультацыі** | | | **здача** |
| | **18.09** | **21.10** | **16.11** | **06.12** |
| 1. Аўдыя- і відэазапісы выбітных фальклорных канцэртаў Паўночнай Беларусі. | + | | | + |
| 2. Аўдыя- і відэазапісы выбітных фальклорных канцэртаў Паўднёвай Беларусі. | | + | | + |
| 3. Аўдыя- і відэазапісы выбітных фальклорных канцэртаў Цэнтральнай Беларусі. | | | + | + |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ГРАФІК КАНТРОЛЮ**

**САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ**

па дысцыпліне **ЭТНАФАНІЧНЫ ПРАКТЫКУМ: КЛАС ФАЛЬКЛОРНА-ВЫКАНАЛЬНІЦКАГА МАЙСТЭРСТВА**

***303 гр. ФТБКСМ***

| **Тэмы** | **даты кантролю** | | | |
|---|---|---|---|---|
| | **Кансультацыі** | | | **здача** |
| | **18.09** | **21.10** | **16.11** | **22.11** |
| 1. Сцэнічная канцэртная праграма фальклорнага калектыва, прымеркаваная да веснавога сезону. | + | | | + |
| 2. Сцэнічная канцэртная праграма фальклорнага калектыва, прымеркаваная да летняга сезону. | | + | | + |
| 3. Сцэнічная канцэртная праграма фальклорнага калектыва, прымеркаваная да восеньскага сезону. | | | + | + |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ

## САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

па дысцыпліне **ЭТНАФАНІЧНЫ ПРАКТЫКУМ: КЛАС ФАЛЬКЛОРНА-ВЫКАНАЛЬНІЦКАГА МАЙСТЭРСТВА**

1. Азнаямленне з народнымі музычнымі інструментамі-аэрафонамі: парныя дудкі.
2. Азнаямленне з народнымі музычнымі інструментамі-аэрафонамі: дудка.
3. Азнаямленне з народнымі музычнымі інструментамі-аэрафонамі: дуда.
4. Азнаямленне з народнымі музычнымі інструментамі-хордафонамі: гуслі.
5. Азнаямленне з народнымі музычнымі інструментамі-хордафонамі: скрыпка.
6. Азнаямленне з народнымі музычнымі інструментамі-хордафонамі: гудок.
7. Азнаямленне з народнымі музычнымі інструментамі-ідэяфонамі: бубен з калатушкай.
8. Азнаямленне з народнымі музычнымі інструментамі-ідэяфонамі: барабан.
9. Азнаямленне з народнымі музычнымі інструментамі-ідэяфонамі: варган.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.3 ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ І ЭКЗАМЕНУ, ВЫНІКОВАЙ АТЭСТАЦЫІ

### ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ

1. Стылі выканання фальклору.
2. Вакальны і харэаграфічны трэнінг.
3. Склад фальклорнага гурта.
4. Беларускі фальклор у ХХ стагоддзі. Выканальніцкія накірункі у фальклоры ХХ стагоддзя.
5. Беларускія народныя песні «Юрачка», «Чачотка».
6. Беларускі фальклор у ХХІ стагоддзі. Выканальніцкія накірункі ў фальклоры ХХІ стагоддзя.
7. Беларускія народныя песні «Базар», «Цяцерка».
8. Найгрышы і напевы да песень «Базар», «Цяцерка», «Лявоніха».
9. Фальклор і постфальклор.
10. Маладзёжны фальклорны рух.
11. Вакальны трэнінг у фальклорным гурце.
12. Рэгіянальныя асаблівасці спеўнага фальклорнага выканальніцтва.
13. Выкананне спеўнага фальклору ў розных камунікацыйных сітуацыях.
14. Формульныя спевы і спевы з імправізацыяй.
15. Спевы з шумавым акампанементам.
16. Найгрышы і напевы да песень «Юрачка», «Чачотка» «Цярэшка».
17. Спевы з носьбітамі фальклорнай традыцыі.
18. Сцэнічная адаптацыя спеўнага фальклору.
19. Вакальны і харэаграфічны трэнінг.
